Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 70 к. „ 3 „ — 2 р. — к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 7 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя—20 к., мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нанпарадні пасьля тэксту — р. 50 к. За радок нанпарадні наперад тэксту 1 р. — к. За радок нанпарадні перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. дарожэй. Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Бесплацоўн. і чарговтармійцы за дакумант — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пошт.-тэл. канторах.

АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

8 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 273 (2165) Пятніца, 2-га сьнежня 1927 г.

Аб скліканьні другой сэсіі ЦВК БССР VIII скліканьня.

Другая сэсія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў Беларускае ССР VIII скліканьня склікаецца на 3 студзеня 1928 г. у гор. Менску.

Парадак дню сэсіі наступны:

1. Бюджэт БССР на 1927-1928 г.
2. Становішча і далейшыя пэрспэктывы разьвіцьця народнае гаспадаркі БССР.
3. Аб сыстэме народнае асьветы.
4. Рацыяналізацыя савецкага апарату і задачы яго ўзмацненьня.
5. Зьмены ў складзе ўраду БССР.
6. Зацьверджаньне законаў, прынятых паміж першай і другой сэсіямі ЦВК БССР.

Сэкратар ЦВК БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

Гор. Менск, 1 сьнежня 1927 г.

Рыхтуйцеся да перавыбараў саветаў.

У сёньнешнім нумары «Савецкай Беларусі» друкуецца абазнік ЦВК БССР аб перавыбарах саветаў на 1927-28 год.

Перавыбарчая кампанія БССР пачнецца з 1-га студзеня 1928 году. У працягу гэтага месяца мясцовыя саветы, партыйныя і грамадзкія арганізацыі, кіруючыся ўказаньнямі ЦВК, павінны падрыхтаваць перавыбарчую кампанію. Гэту падрыхтоўку неабходна распачаць зараз-жа.

Перавыбарчая кампанія на вёсцы, гэта праверка лініі партыі ў адносінах да сялянства, праверка працы дзяржаўнага апарату ад нізу да верху. З другога боку, гэта—праверка адносін працоўных мас да сваёй дзяржавы.

Мінулыя перавыбары і гадавая дзейнасьць саветаў са ўсёй яскрасьцю паказалі значны рост актыўнасьці выбаршчыкаў, рост колькасьці жанчын у саветах, рост уплыву ў вясковых саветах беднаты. Лінія партыі на ажыўленьне саветаў, на ўцягненьне ў іх працу ўсё больш пластоў працоўных цалкам сябе апраўдала.

Яшчэ больш павінна быць узьнята актыўнасьць усіх працоўных, яшчэ больш настойліва трэба дамагацца арганізацыі беднаты і батракоў. У саветах павінна ўзяць больш ўдзел жанчына, а ўдзел кулака ў саветах павінен быць зусім адсунут.

Два мінулыя гады асабліва яскрава паказалі, што саветы на вёсцы ёсьць ня толькі адміністрацыйныя арганізацыі—усё больш павялічваецца іх роля як арганізатараў сацыялістычнай вёскі.

У чым гэта выяўляецца?

Ці мы возьмем зямельнае пытаньне, ці каапэрацыю, ці будаўніцтва калектыўных гаспадарак і г. д.,—у кожным з гэтых найбольш важных пытаньняў вельмі шмат залежыць ад саветаў, куды і як павернецца справа: на беднату, проці кулака, ці наадварот; у карысьць большасьці вёскі—беднаты, серадняку, проці капіталістычнае верхавіны, ці наадварот.

Савет павінен кіраваць сельска-гаспадарчай каапэрацыяй, а сельска-гаспадарчая каапэрацыя на вёсцы зараз, гэта—важнейшы фронт клясавае барацьбы. Ці выканае каапэрацыя тыя задачы, якія стаяць перад ёю ў сэнсе правільнага выкарыстаньня фондаў беднаты, у сэнсе захаваньня ўсіх указаньняў аб пераважным крэдытаваньні адчуваючых патрэбу несаможных гаспадарак, ці падтрымлівае яна тыя грамадзкія пачынаньні, якія зьвязаны з пераходам вёскі да новых формаў гаспадаркі і г. д.?

Усе гэтыя цікавыя пытаньні не зьяўляюцца зараз чужымі і стороннімі для саветаў. Кіруючая роля савету мае тут вялізарнае значэньне.

Усё гэта даводзіць, што палітычнае значэньне саветаў у вёсцы з году ў год павялічваецца. Палітыка партыі і савецкай улады, накіраваная да далейшага ўзмацненьня каапэрацыйных, калектыўных, сацыялістычных элемэнтаў у вёсцы, можа быць з посьпехам праведзена толькі пры адпаведным энэргічным кіраўніцтве ўсім вясковым жыцьцём в боку мясцовых саветаў.

Таму партыйныя арганізацыі на мясцох павінны аднесьціся да перавыбараў саветаў, як да важнейшай палітычнай кампаніі, у якой кулацкая частка вёскі павінна атрымаць рашучы адпор, і ў той жа час перавыбарная кампанія павінна быць выкарыстана для арганізацыі беднаты. Неабходна дамагацца, каб беднота ўсё больш арганізавана, згрупавана і сьвядома выступала за інтарэсы савецкай, сацыялістычнай вёскі, захапляючы прыкладам сваёй арганізаванасьці серадняка, даючы супольна з ім адпор кулаку.

Надыходзячыя перавыбары саветаў павінны праходзіць пад лёзунгам замацаваньня самай шчыльнай сувязі саветаў з мілённымі масамі выбаршчыкаў. У гэтым іх асноўнае палітычнае значэньне.

Кожны савет павінен здаць справаздачу перад выбаршчыкам і яшчэ раз праверыць, ці ўсе наказы ён выканаў; кожны член савету павінен здаць справаздачу аб сваёй працы сваім выбаршчыкам; кожны савет павінен быць гатовым даць адпор кулакам і ўважліва сачыць за тым, каб кулак не напаў у сьпісы выбаршчыкаў.

Вось тыя задачы, якія мясцовыя саветы павінны пачаць зараз-жа праводзіць, рыхтуючыся да кампаніі па перавыбарах саветаў.

АДЧЫНЕНЬНЕ СЭСІІ ЛІГІ НАЦЫЙ.

ПЕРАМОГА ДЭЛЕГАЦЫІ СССР ПРЫ ЎСТАНАЎЛЕНЬНІ ПАВЕСТКІ ДНЮ.

ЖЭНЕВА, 30-XI. 30 лістапада а 11-й гадз. раніцы 4-я сэсія падрыхтоўчае камісіі да канфэрэнцыі аб разброеньні была адчынена старшынёю камісіі Лёўдонам (Галяндыя).

На сэсіі прысутнічаюць прадстаўнікі 26 дзяржаў.

Лёўдон у сваёй прамове вітаў дэлегацыю СССР. Лёўдон далей заявіў, што, па яго думцы, праца па пытаньнях разброеньня павінна ісьці паступова і поруч з працаю камісіі па пытаньнях гарантый безапаснасьці. Лёўдон падкрэсьліў сваё жаданьне, каб СССР і Злучаныя Штаты выявілі сваю пазіцыю па пытаньні аб іх уваходзе ў камісію безапаснасьці.

Бэрнсдорф (Нямеччына) выказаўся за тое, каб надаць повапрыехаўшым удзельнікам сэсіі магчымасьць падрабязна выказаць свой погляд і прапанаваў зьмяніць парадак дню сэсіі такім парадкам, каб агульныя спрэчкі адбываліся перад сфармаваньнем камісіі па пытаньнях гарантый безапаснасьці.

Літвінаў падтрымаў прапанову Бэрнсдорфа.

Плян некаторых дэлегацый перашкодзіць абвяшчэньню савецкае дэкларацыі скончыўся няўдачаю, хоць Лёўдон і намякаўся абыйсьці прапанову Літвінава-Бэрнсдорфа шляхам фармальнага адзначэньня, што ніхто не прасіў слова і такім парадкам пераскочыць да першага пункту парадку дню сэсіі. Аднак гэтая спроба Лёўдона не ўдалася, дзякуючы энэргічнаму выступленьню Літвінава.

Далей з прамоваю выступіў тав. Літвінаў.

ДАМАГАНЬНІ ПОЛЬШЧЫ Ў ЛІЗЕ НАЦЫЙ.

На сэсіі Лігі Нацый Польшча выступіць з наступнымі мэтамі: Польшча жадае спыненьня так званага „стану вайны"; Польшча жадае навязаньня нармальных дыпляматычных і гаспадарчых стасункаў; Польшча лічыць спыненьне „становішча вайны за варунак рачавага разгледжаньня скаргаў літоўскага ўраду на паступкі польскага ўраду".

ПОЛЬСКА-ЛІТОЎСКІЯ АДНОСІНЫ НЕ ПАЛЕПШЫЛІСЯ.

Магчымы новы літоўскі ўрад.

«Берлінэр Тагеблят» паведамляе, што апазіцыйныя партыі адбываюць новыя нарады, на якіх абгаварваюць праграму новага ўраду. Як кандыдатаў новага ўраду, называюць: прэм'ер—палкоўнік Мэркіс (нацыяналіст), упаўнаважаны спраў Энюлайціс (хадэк), замежных спраў—Вальдэмарас (нацыяналіст), вайсков. спраў—Даўкантас (нацыяналіст), скарбу—Рымка (народны сац.), земляробства — Стульгінскі (сял. партыя).

Вальдэмарас і Пілсудзкі.

Як паведамляе «Роботнік», Вальдэмарас думае, што пальля спатканьня з марш. Пілсудзкім у Жэнэве ён вернецца з гатовым паразуменьнем па польска-літоўскіх справах і што паразуменьне з Польшчай запэўніць яму падтрыманьне Англіі і Францыі і дазволіць яму ўтрымаць дыктатуру ў Літве.

ВОДГУКІ НА КАНФЛІКТ У ПЭРСІІ.

ТЭГЕРАН, 30-XI. У апошнія дні ўся прэса прысьвячае перадавіцы польска-літоўскаму канфлікту. Прэса востра ганьбіць палітыку Польшчы, накіраваную да захопу Літвы, зазначаючы, што такая палітыка можа выклікаць новую вайну і што Нямеччына і СССР ня здолеюць застацца спакойнымі ў дачыненьні да наскоку на Літву.

ШЫРОКІ АДПОР АНГЕЛЬСКАМУ ЗАМАХУ НА ПРАВЫ ІНДЫІ.

УВЕСЬ КРАЙ ДЭМАНСТРУЕ СВАЮ НЯНАВІСЬЦЬ ДА КАМІСІІ БІРКЕНХЭДА.

Антыангельскія мітынгі пратэсту.

КАБУЛ, 30-XI. Індыйскі друк паведамляе, што па ўсёй Індыі адбываюцца мітынгі пратэсту проці ўтворанае ангельцамі камісіі па пераглядзе канстытуцыйных рэформ у Індыі. Некаторыя арганізацыі ўхвалілі рэзалюцыі з заклікам байкатаваць камісію. Агітацыя за байкот ня спыняецца.

Газэты зьмяшчаюць артыкулы індусскіх лідэраў, якія таксама заклікаюць да байкоту.

У Бамбэі адбыўся масавы мітынг пратэсту, у якім удзельнічалі прадстаўнікі ўсіх партый. Прамоўцы падкрэсьлівалі недапусьцімасьць удзелу ў працы ангельскае камісіі, якая зьяўляецца зьнявагаю і кпінамі над індыяй. Далей прамоўцы зазначалі, што стварэньне камісіі адхіляе сабою права індыйскага народу на раўнаправны ўдзел у выпрацоўцы будучае канстытуцыі краю. Пасьля мітынгу была ўхвалена рэзалюцыя пратэсту з заклікам байкатаваць камісію.

Заклік выканкому рабоча-сялянскае партыі.

КАБУЛ, 30-XI. Выканком рабоча-сялянскае партыі Індыі агаласіў у Бамбэі адозву, у якой зазначана: „Рабоча-сялянская партыя, якая прадстаўляе мілёны эксплёатуемых, стаіць за ўсеагульны байкот каралеўскае камісіі. Разам з правядзеньнем байкоту супольна з іншымі партыямі рабоча-сялянская партыя выкарыстае ўсе сродкі і ўвесь свой уплыў, каб правесьці байкот у больш канкрэтнай форме, чымся адмова дапамагаць працы камісіі». Партыя ня мае ніякіх ілюзій. Яна ўпэўнена, што не назначэньнем камісіі, а пры ўмове актыўнага ўдзелу арганізаваных рабоча-сялянскіх мас можна дамагчыся рэальных палітычных выпікаў. Партыя заклікае працоўных паказаць свае салідарныя адносіны да камісіі шляхам масавых выступленьняў, ня спыняючыся перад дэманстрацыямі і забастоўкамі.

За адзіны фронт усіх нацыянальнасьцяў у байкоце.

КАБУЛ, 30-XI. 20-га лістапада на пасяджэньні пэнджабскага камітэту халіфату была аднагодна ўхвалена такая рэзалюцыя: «Пэнджабскі камітэт халіфату лічыць, што толькі мешаная канфэдэрацыя, у якой будуць удзельнічаць у якасьці ўпаўнаважаных і вырашаць пытаньні індыйскае канстытуцыі і ангельскія і індыйскія дзеячы, можа здаволіць патрабаваньні краю. Нішто іншае не сумяшчаецца з гонарам народу. Супрацоўніцтва з каралеўскай камісіяй супярэчыць інтарэсам народу.

З прычыны існуючай у краі нацыянальнай варожасьці, камітэт заклікае індыйскі нацыянальны кангрэс і іншыя арганізацыі ўжыць неадкладныя захады, каб прыяцельскі вырашыць палітычныя і рэлігійныя пытаньні з мэтаю стварыць сырыяючыя ўмовы для посьпеху мешанае канфэрэнцыі».

„Ня мець ніякае справы з каралеўскай камісіяй".

КАБУЛ, 30-XI. На сходзе актыўных дзеячоў нацыянальнага кангрэсу ў Джабалпуры была ўхвалена дэкларацыя, у якой зазначана: „Народ ніколі не натрабаваў стварыць такую камісію. Назначэньне камісіі ў такім складзе адбылося з надзеяй, што Індыя, раздробленая нацыянальна і палітычна, ня здолее заявіць адпаведны пратэст. Ангельцы хочуць выкарыстаць выпадак, каб абдурыць увесь сьвет і напесьці ўдар Індыі. Мы заклікаем жыхарства цэнтральных правінцый ня мець аніякае справы з гэтай камісіяй».

ПОЛЬШЧА ПЕРАД НОВЫМІ ВЫБАРАМІ.

ХТО ЎВАХОДЗІЦЬ У БЛЁК НАЦМЕНШАСЬЦЯЎ.

У блёк нацыянальных меншасьцяў увайшлі ўсе тыя арганізацыі, якія выдаюць месячнік «Нацio», прысьвечаны справам нацменшасьцяў: яўрэі-сыяністы, беларусы групы Яромича, украінцы групы Лусяна, немцы групы Гасбаха і ліцьвіны групы Альсейні. Блёк у такім відзе захоплівае значна меншыя колы нацменшасьцяў і па сваёй сутнасьці зьяўляецца больш правым і буржуазным.

ПАСЬЛЯ СКАНАНЬНЯ СОЙМУ.

Польская прэса прысьвячае факту скананьня польскага сойму сваі ўвагі. Агульны голас аб былым сойме не на яго карысьць. Усе згаджаюцца, што сойм быў няўдалы і нічога на даў. Але вось толькі пэпэсэўскі «Роботнік» у артыкуле п. пасла Педзялкоўскага заяўляе: «Мы да гэтага хору (крытыкаў Рад.) не прылучаемся». Што значыць залезьці па вушы ў парляментарнае балота!

НОВАЕ ЎЗБРОЕНЬНЕ ПОЛЬСКАЙ ПАЛІЦЫІ.

Польская паліцыя ўзброена новымі кулямётнымі мэханічнымі карабінамі маркі «Кольт-Топпон», якія да апошняй пары ўжываліся толькі ў амэрыканскай паліцыі. Такі карабіны выкідае ў хвіліну 1000 куль.

«Последний нонешний денечек».

28 лістапада, у апошні дзень пасольскіх мандатаў, шмат паслоў сойму зьехалася ў Варшаву і бадзялася па сойму. Выехаць з Варшавы ім прышлося ўжо на свой уласны кошт, бо было выдана распараджэньне аб нянрызнаваньне ў ноч з 28 на 29 лістапада права паслоў на бясплатны праезд у 1 клясе.

Падвышка тарыфу.

Ад 1 сьнежня г. г. у Польшчы падвышан тарыф на пошце і тэлеграфе.

Апошняе пасяджэньне ўкраінскага ілюбу.

Украінскі соймавы клюб адбыў 28 лістапада апошняе пасяджэньне, на якім пастанавіў выдаць адозву да ўкраінскага народу.

Разгон украінскае філянтропічнае арганізацыі.

ВАРШАВА, 30-11. Распушчан украінскі камітэт дапамогі пацярпеўшым ад разводзьдзя. Члены камітэту Брайковіч і Сораневіч арыштаваны за адмову выдаць рэшткі сум, сабраных у карысьць пацярпеўшых.

Інвалідная дапамога бандытам.

ВАРШАВА, 30-11. На падставе прэзыдэнцкага дэкрэту выдадзен загад аб выдачы інвалідных дапамог інвалідам, служыўшым у атрадах Пятлюры, Булак-Балаховіча і Якаўлева, якія змагаліся на баку Польшы.

Выбары ў мясцовыя рады.

Апошнія выбары ў мясцовыя рады ў Жырардаве і Радамаку далі перавагу левым польскім партыям. камуністычныя сьпіскі былі забаронены.

Забастоўка на фабрыцы мэблі.

На фабрыцы мэблі Срочынскага выбухнула новая забастоўка. Рабочыя вымагаюць падвышкі платы.

Хаўтуры камуніста.

28 лістапада намёр у Стрыю адзін з правадыроў тамашніх камуністаў Ян Маента. У хаўтурах прынялі ўдзел прафсаюзныя арганізацыі з сьцягамі. На могілках былі сказаны адпаведныя прамовы. Разумеецца, паліцыя была пры гэтым змабілізавана.

Чыгуначная катастрофа.

На лініі Пазнань-Остраў пры станцыі Біней стаўкнуліся два таварныя поезды. 13 вагонаў разьбіты. Адзін цягнік глыбока зарыўся ў зямлю.

У Заходняй Беларусі.

Арышты ў Маладэчне.

ВАРШАВА, 30-XI. У Маладэчне арыштавана 9 чалавек па абвінавачаньні ў прыналежнасьці да кампартыі Заходняе Беларусі.

НЯЎДАЛЫ СХОД РАГУЛІ.

На 21 лістапада, як паведамляе «Беларускі Дзень», пасол Рагуля склікаў у Навагародку, у залі кінематаграфу, сход, на якім меўся зрабіць даклад. Ня гледзячы на тое, што ў гэты дзень у Навагродку быў кірмаш і народу зьехалася шмат з усіх бакоў Навагрудчыны, сход не адбыўся, таму што ніхто на яго не зьявіўся.

«Аб'яднаньне» і беларусы Умястоўскага.

Да аб'яднаўшыхся нядаўна на кангрэсе ў Вільні польскіх партый: часткі «Вызваленьня», польскай сялянскай партыі і саюзу дробных земляробаў, якія аб'ядналіся пад назваю „Аб'яднаньне", далучыўся і Умястоўскі з сваёю радыкальнаю партыяй.

ЗА КОШТ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТАЎ.

ПЕРАМОГА ШВЭЙЦАРСКАЕ КАМПАРТЫІ НА ВЫБАРАХ У БАЗЭЛІ.

БЭРЛІН, 30-11. У Базэлі на муніцыпальных выбарах кампартыя атрымала 1.598 галасоў (на мінулых выбарах у 1924 г.—1.358), а сацыял-дэмакратычная партыя 2.330 галасоў (на мінулых выбарах у 1924 г.—2.542).

У рабочых райёнах лік галасоў, атрыманых кампартыяй, неравышае лік галасоў, атрыманых сацыял-дэмакратамі. Посьпех камуністаў набывае асаблівае значэньне, ў зьвязку з тым, што сацыял-дэмакратычныя лідэры праводзілі перадвыбарчую кампанію пад знакам цкаваньня камуністаў.

Антыфашысцкія непарадкі ў Італіі.

ПАРЫЖ, 23-XI. З Трыесту паведамляюць, што па ўсёй Італіі адбыліся шматлікія арышты, у зьвязку з рухам проці распачатага фашысцкім урадам скарачэньня заработку.

У Галярта і Буста-Арсічыё,—у цэнтры тэкстыльнае прамысловасьці Ламбардыі—выбухнула забастоўка пратэсту проці скарачэньня заработку. Рабочыя выйшлі на вуліцу са сьпевамі антыфашысцкіх песьняў. Улада выслала для прыдушэньня непарадкаў 4 грузавікі з карабінэрамі. Водлуг чутак два з бастуючых забіты.

Як „разбройваецца" Англія.

ЛЁНДАН, 30-XI. Агэнцтва Рэйтэра паведамляе: „Адказваючы на запытаньне ў палаце вобшчын, таварыш міністра авіяцыі Сассун заявіў, што ў сучасны момант ангельскі паветраны флёт налічвае 750 самалётаў першага рангу, з якіх няма ніводнага старэй 1919 году,

Арышт с.-д. дэпутата Валіша.

ВЕНА, 24-XI. Штырыйскі ляндтаг пастанавіў пазбавіць сацыял-дэмакратычнага дэпутата Валіша дэпутацкае недатычнасьці і выдаць яго судовай уладзе, распачаўшы проці яго справу на абвінавачаньні „у гвалтоўніцкіх учынках проці афіцыйных асоб" і ў «падахвочваньні да варожых учынкаў».

Пазбаўленьне дэпутацкае недатычнасьці Валіша—першы выпадак выдачы дэпутата судовай уладзе ў якасьці абвінавачванага на палітычнай справе ў парляманцкай практыцы Аўстрыі. Валіш кіраваў забастоўкаю рабочых у невялікім гарадку Друку на Муры і заклікаў рабочых у час забастоўкі не падначальвацца загадам паліцыі.

Паглыбленьне палітычнага крызісу ў Румыніі.

ВЕНА, 30-11. Водлуг паведамленьняў з Бухарэсту, нацыянальна-сялянская партыя адхіліла прапанову прэм'ера Вінтылы Братыяну аб заснаваньні кааліцыйнага ўраду, у якім нацыянальна-сялянская партыя мела-б амаль палову міністэрскіх партфэляў.

Паклёпы цьвёрдалобых пісак на СССР.

ЛЁНДАН, 30-XI «Дэйлі Мэйль» распачала агалошваць артыкулы свайго карэспандэнта Філіпса аб нібы бальшавіцкіх кампаніях на Далёкім Усходзе. Першы артыкул з Батавіі трактуе на тэму «аб сканцэнтраваньні сіл Масквы, каб бальшавізаваць Яву і Суматру. Гэта нібыта робіцца з мэтаю „заснаваньня моцнае стратэгічнае базы для новае кампаніі проці ангельскае імпэрыі".

Чэхаславацка-расейская гандлёвая палата.

ПРАГА, 30-XI. На 8 сьнежня назначаецца адчыненьне чэхаславацка-расейскае гандлёвае палаты. Сябрамі палаты ад Чэхаславакіі лічацца шматлікія выдатныя фірмы. Ад СССР сябрамі палаты зьяўляюцца гандлёвае прадстаўніцтва ў Празе і шматлікія трэсты, сындыкаты і каапэратывы.

Паглыбленьне савецка-пэрсідзкае прыязьні.

ТЭГЕРАН, 30-XI. 30-га лістапада ў паўнамоцным прадстаўніцтве СССР адбыўся банкет у чэсьць пэрсідзкага ўраду ў адзнаку падпісаньня савецка-пэрсідзкіх згод. Паўнамоцны прадстаўнік СССР тав. Даўцян і пэрсідзкі прэм'ер у сваіх прамовах падкрэсьлівалі паглыбленьне прыяцельскіх адносін між Пэрсіяй і СССР і сымпатыі Савецкага Саюзу ў барацьбе Пэрсіі за незалежнасьць.

Весткі адусюль.

ФАШЫСЦКІЯ НАПАДЫ НА ЧЫРВОНЫХ ФРАНТАВІКОЎ.

БЭРЛІН, 28-XI. У Франкфурце на Майне адзін з працаўнікоў мясцовага саюзу чырвоных франтавікоў падпаў нападу групы членаў фашысцкае арганізацыі «Сталёвы Шлем», якія нажамі напесьлі яму сьмяротныя раны.

НЯМЕЦКІЯ РЭФАРМІСТЫ СКАРЫСТОЎВАЮЦЬ УРБАЖАЎЦАЎ ДЛЯ НАПАДАК НА СССР.

БЭРЛІН, 27-XI. Агульны сход рабочых на прадпрыёмствах бэрлінскае фірмы Рот і Бюхнэр амаль аднагодна пастанавіў заслухаць на бліжэйшым сходзе даклад нямецкае рабочае дэлегацыі, наведаўшае СССР.

У адказ на гэта рэфармісцкі прадстаўнік нямецкага саюзу мэталістаў падаў прапанову адначасна заслухаць садаклад прадстаўніка «ультра левае апазіцыі» камуністычнае партыі Нямеччыны.

У Саюзе ССР.

СЁНЬНЯ ПАЧЫНАЕЦЦА XV ПАРТЗЬЕЗД.

ПАРАДАК ДНЮ ЗЬЕЗДУ.

МАСКВА. XV зьезд УсеКП(б) адчыняецца 2-га сьнежня а 6-й гадз. увечары ў Крамлі.

Парадак дню зьезду: 1) справаздача ЦК УсеКП(б) (палітычная і арганізацыйная), дакладчыкі т. т. Сталін і Касіёр;

2) справаздача цэнтральнае рэвізійнае камісіі, дакладчык т. Курскі;

3) справаздача ЦКК—РСІ, дакладчык т. Арджанікідзэ;

4) справаздача дэлегацыі УсеКП(б) у выканкоме Камінтэрну, дакладчык т. Бухарын;

5) дырэктывы па складаньні 5-цігадовага пляну народнае гаспадаркі, дакладчыкі т.т. Рыкаў і Крыжаноўскі;

6) аб працы ў вёсцы, дакладчык т. Молатаў;

7) выбары цэнтральных установаў партыі.

ПАРТЫЯ ПЕРАД XV ЗЬЕЗДАМ.

Поўны провал апазіцыі ў Закаўкаснай фэдэрацыі.

ТЫФЛІС, 30-XI. На 12-ці сходах актыву закаўкаскіх арганізацый, скліканых для абмеркаваньня тэзісаў ЦК УсеКП(б), прысутнічала 4.516 камуністаў. За лінію ЦК галасавала 4.453, устрымаўся 1, проці галасавала 36 чалавек.

* * *

МАСКВА. Па Масква і губерні на 29 лістапада ўключна рабочыя і работніцы падалі 10.823 заявы аб прыёме ў партыю. З агульнага ліку пададзеных заяў палова ўжо прайшла прыёмачныя камісіі.

МАСКВА, 30-XI. Ад пачатку дыскусіі з 13.864 прысутнічаўшых на сходах за тэзісы ЦК галасавала 13.714, за тэзісы апазіцыі—70, устрымаўся 80.

Выключэньне з кампартыі Грузіі.

ТЫФЛІС. Прэзыдыум ЦКК кампартыі Грузіі пастанавіў выключыць з кампартыі 35 актыўных фракцыянераў і дэзарганізатараў.

ПРОВАДЫ АНГЕЛЬСКАЕ І ІРЛЯНДЗКАЕ РАБОЧЫХ ДЭЛЕГАЦЫЙ.

ПРАДСТАЎНІКІ ДЭЛЕГАЦЫЙ ПАКЛЯЛІСЯ БАРАНІЦЬ СССР АД АНГЕЛЬСКАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ.

МАСКВА, 30-XI. Выехалі з Масквы на бацькаўшчыну рабочыя дэлегацыі Англіі і Ірляндыі.

Дэлегацыям былі наладжаны маскоўскімі рабочымі ўрачыстыя провады. На мітынзе на прываказальным плацы Яглом (УЦСПС) прасіў перадаць ангельскім рабочым гарачае прывітаньне ад рабочых СССР і заверэньні, што савецкія рабочыя і ў далейшым гатовы аказаць ангельскім рабочым усялякае падтрыманьне і дапамогу ў іх клясавай барацьбе.

Старшыня ангельскае рабочае дэлегацыі Лаўтэр сказаў: „Мы тут клянёмся баранiць цэласьць і мірнае жыцьцё ў СССР. Гэтую клятву мы выканаем да канца. Мы—браты рабочае клясы СССР у барацьбе, мы разам з імі будзем дамагацца новых перамог. Стоючы вышэ на тэрыторыі СССР, мы заяўляем, што не супакоімся да тае пары, пакуль у нашым краі не пераможа праца. Ангельская рабочая дэлегацыя пераканана, што 20-ую ГАДАВІНУ КАСТРЫЧНІКАВАЕ РЭВАЛЮЦЫІ РАБОЧЫЯ СССР І АНГЛІЯ СПАТКАЮЦЬ РАЗАМ, ПАД ЧЫРВОНЫМ ПЕРАМОЖНЫМ СЬЦЯГАМ".

Старшыня ірляндзкае рабочае дэлегацыі т. Монэй заявіў: „Мы абяцаем вам прысьлаць праз кенаторы час прадстаўнікоў вольнае і незалежнае ірляндзкае рэспублікі. Калі імпэрыялізм Англіі адважыцца выступіць проці СССР, дык мы клянёмся змагацца з вамі поруч за нашую агульную справу".

АНГЕЛЬСКАЯ КААПЭРАЦЫЯ НА АБАРОНЕ СССР.

Дэкларацыя ангельскае каапэрацыйнае дэлегацыі.

МАСКВА, 30-XI. Ангельская каапэрацыйная дэлегацыя ў СССР у сваёй дэкларацыі з абурэньнем гаворыць аб антысавецкай палітыцы кансэрватараў.

Заявяем,—гаворыцца ў дэкларацыі—што ангельскія каапэратары не падзяляюць пазіцыі ангельскага ўраду ў адносінах да СССР. Ангельскі каапэрацыйны рух павінен выкарыстаць кожную магчымасьць дзела абароны СССР ад ангельскага імпэрыялізму.

К-т адзінства транспартнікаў Ірляндыі і СССР.

МАСКВА, 30-XI. На аб'яднаным пасяджэньні прэзыдыуму ЦК транспартнікаў СССР і прадстаўнікоў рабочага саюзу Ірляндыі, а таксама і ірляндзкага транспартнага саюзу пастаноўлена заснаваць камітэт адзінства рабочых транспартнікаў СССР і Ірляндыі дзеля ўсямернага міжнароднага падтрыманьня транспартных рабочых у часе лёкаутаў і стачак, а таксама дзеля барацьбы за адзінства транспартнага руху ў нацыянальным і міжнародным абхвацe

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1-й гадз. уночы).

Дэкларацыя СССР у Жэневе.

ЖЭНЕВА, 1-XII. Сваю прамову тав. Літвінаў пачынае абвяшчэньнем дэкларацыі, у якой гаворыцца, што Савецкі ўрад застаецца пры думцы, што пры ўмовах капіталістычнага строю няма грунту лічыць, што зьнікнуць прычыны, якія прыводзяць да ўзброеных канфліктаў.

Далей у дэкларацыі зазначаецца на рост мілітарызму ў капіталістычных дзяржавах.

Савецкі ўрад заўсёды імкнуўся ставіць пытаньне канкрэтна аб разброеньні, але заўсёды натыкаўся на супроцьдзеньне капіталістычных дзяржаў.

Савецкі ўрад даручыў сваёй дэлегацыі запрапанаваць усім дзяржавам канчаткова распусьціць усё войска і не дапусьціць яго існаваньня ў якой-бы ні было скрытай форме, зьнішчыць усю ваенную зброю, ліквідаваць ваенна-марскі і паветраны флёты, зьнішчыць крэпасьці, ліквідаваць спэцыяльныя вайсковыя заводы, не адпушчаць грошай на ваенныя патрэбы.

Калі разброеньне цяжка будзе ажыцьцявіць адразу, дык дэлегацыя прапануе 4-хгадовы тэрмін для гэтага, а вольныя сродкі пусьціць на культурныя патрэбы.

(Падрабязнасьці аб дэклярацыі ў наступным нумары).

Ангельскі капітал на Балканах.

(Ад нашага карэспандэнта ў Вене)

У апошні час наглядаюцца адзнакі павялічанай актыўнасьці ангельскага капіталу ў балканскіх краёх. Ангельскі капітал праходзіць у эканоміку Румыніі, Югаславіі і Баўгарыі ў форме ўдзелу ў прамысловых прадпрыёмствах і ў форме наданьня крэдыту капіталістам гэтых краёў. Кідаецца ў вочы, што ў апошнія дні ангельскі капітал імкнецца пераважна, калі ня выключна, прайсьці ў сельска-гаспадарчыя прадпрыёмствы. У Румыніі ангельскія банкі ахвотна крэдытуюць уласьнікаў буйных сельска-гаспадарчых латыфундый у Арадзе, Тэмэшвары, Шахумары, Орадэа-Мары і г. д. Малочная гасподарка, прадпрыёмства па перапрацоўцы мяса, лясны[illegible]—усё гэта ў аднолькавай мерэ [illegible]ельскі капітал, які выступае тут у гэткай неўдзельнай ролі аграрнага капіталу.

Што пранікненьне ангельскага капіталу ў галіну сельскай гаспадаркі не выпадкова, сьведчыць і пазіцыя лёндонскай Сіці ва ўнутрана-палітычнай барацьбе балканскіх краёў.

У Румыніі, дзе ва ўладзе знаходзіцца франкафільскі ўрад Братыяну, Англія падтрымлівала апазіцыйныя партыі, — нацыянальную сялянскую партыю, партыю Авэрэску, земляўласьніцкую арыстакратыю Сягіміградзкая, якая аб'ядналася павакол Бэтлена, дзейнасьць прэтэндэнта на румынскі трон быўшага румынскага насьледнага прынца Кароля, які карыстаецца падтрыманьнем у некаторых колах нацыянальнай сялянскай партыі і, як відаць, карыстаецца падтрыманьнем і спачуваньнем ангельцаў. Адзін з кіруючых сяброў нацыянальнай сялянскай партыі, ранейшы міністр фінансаў Міхаіл Пановіч ня так даўно езьдзіў у Лёндан, дзе ён праводзіў перамовы з Дэтэрдынгам. Другі выдатны сябра сялянскае партыі Маджэару зусім нядаўна быў у Парыжы. Пабыт Маджэару ў сталіцы Францыі быў ахутаны заслонаю натаемнасьці. Аднак, вядома, што Маджэару праводзіў доўгія і, як відаць, небескарысныя перамовы з Каролем. Зараз гэтыя дзеячы адкрыта, наколькі дазваляе рэжым Братыяну, і, галоўным парадкам, неадкрыта выступаюць за вяртаньне на румынскі трон Кароля.

[illegible] вострая выяўлена палітыка „мірнай інтэрвэнцыі" ангельскага капіталу ў Югаславіі. Адмаўляючы югаслаўскаму ўраду ў паданьні крэдыту, ангельскі капітал адначасна ўкладае буйныя грашовыя сумы ў сельскую гаспадарку Славеніі і Харватыі. У палітычнай галіне мы бачым той самы малюнак, што і ў Румыніі. Ангельцы падтрымліваюць харвацкую сялянскую партыю Радыча, харвацкі блёк Трумбіча і дэмакратаў Прыбышэвіча, якія змагаюцца проці сучаснага ўраду Югаславіі. Англія марыць у Югаславіі аб ляне акалаіцаў апазіцыйны блёк аграрных партый і груп, як прышоў-бы да ўлады і дазволіў-бы без перашкоды праводзіць яе палітыку.

Не абмінула Англія і Баўгарыю. Там ангельскі ўплыў мае надзейнага праваднika ў асобе сучаснага баўгарскага прэм'ера Лянчава. Невыпадкова Лянчаў імкнецца прыцягнуць да ўдзелу ва ўрадзе баўгарскі сялянскі саюз, невыпадкова імкнецца ён звольніць з пасады міністра замежных спраў франкафіла Муравэ і замяніць яго сваім стаўнікам Молавым.

Паступовае пранікненьне ангельскага капіталу ў балканскія краі мае перш-наперш сваёю мэтаю барацьбу з Францыяй. Англія імкн

Рэзалюцыя XI зьезду КП(б)Б па дакладу ЦК КП(б)Б.

Заслухаўшы і абгаварыўшы справаздачу ЦК КП(б)Б, XI зьезд лічыць палітычную і арганізацыйную лінію, якую праводзіць Цэнтральны Камітэт, правільнай і поўнасьцю ўхваляе ўсю праробленую працу.

Зьезд лічыць, што прынцыповая лінія і практычная праца Цэнтральнага Камітэту забясьпечылі ідэёвае ленінскае згрупаваньне шэрагаў КП(б)Б і прывялі да рашучага ідэёва-палітычнага разгрому трацкісцкай апазіцыі, якую таксамо палітычна асудзілі шырокія масы рабочай клясы Беларусі.

Зьезд канстатуе, што ўся дзейнасьць Цэнтральнага Камітэту забясьпечыла ўзмацненьне ўплыву партыі ў ірал тарскіх масах. Гэта выявілася ў высокім палітычным уздыме і актыўнасьці рабочых мас у пытаньнях міжнароднай палітыкі, як-та: адносіны да кітайскай рэвалюцыі, магутны водгук на падзеі ў Вене, пратэст проці пакараньня сьмерцю Сако і Ванцэці, разрыў з Англіяй, забойства т. Войкава, абмеркаваньне пытаньня аб ваеннай небясьпецы, дапамога сялянству Зах. Беларусі і г. д.,—ва ўсіх гэтых пытаньнях пралетарыят Беларусі выявіў сваю міжнародную пралетарскую салідарнасьць і поруч з гэтым сваю самаахвярную рашучасьць бараніць сваю рабочую і сацыялістычную бацькаўшчыну.

Другім важным момантам, характарызуючым рост палітычнай актыўнасьці пралетарыяту БССР і яго давер'е партыі, зьяўляліся за справаздачны пэрыяд: перавыбары саветаў, шырокі ўдзел рабочых мас у штодзённай працы па сацыялістычнаму будаўніцтву.

Зьезд даручае Цэнтральнаму Камітэту і ўперад усе важнейшыя пытаньні міжнароднай палітыкі своячасова асьвятляць перад шырокімі рабочымі і сялянскімі масамі.

XI зьезд КП(б)Б са задаволеньнем адзначае, што, не зважаючы на цэлы шэраг аб'ектыўных цяжкасьцяў (слабое разьвіцьцё прамысловасьці і нізкі, амаль рамесны, узровень тэхнікі, малазямельле і адсталасьць сялянскіх гаспадарак, перажыткі існуючай пры царызьме мяжы аседласьці для яўрэйскага насельніцтва, культурная адсталасьць і перажыткі пэрыяду русіфікацыі, шматнацыянальны склад насельніцтва, прыгранічнае становішча),—правільная палітыка ЦК забясьпечыла няўхільны рост народнай гаспадаркі Беларусі, агульны гаспадарчы ўздым, узмацненьне сацыялістычнага сэктару, няўхільнае выціскаьне прыватна-капіталістычных элемэнтаў як у прамысловасьці, так і ў гандлі.

Ухваляючы чыннасьць ЦК у галіне складаньня пяцігадовага пляну разьвіцьця народнай гаспадаркі БССР, зьезд даручае ў далейшым сканцэнтраваць асаблівую ўвагу на наступных пытаньнях:

ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ.

Далейшае павялічэньне ўдзельнай вагі прамысловасьці ва ўсёй народнай гаспадарцы БССР, дамагаючыся поўнага ажыцьцяўленьня прамысловага будаўніцтва, намечанага пяцігадовым плянам.

Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута сканчэньню пабудовы Асінстрою, які зьяўляецца важнейшым фактарам у справе разьвіцьця прамысловасьці.

Побач з неабходнасьцю фарсіраваньня тэмпу прамысловага будаўніцтва, зьвярнуць асаблівую ўвагу на эканомію, патаненьне і максымальнае скарачэньне тэрміну будаўніцтва, рацыяналізацыю вытворчасьці, палепшаньне тэхнікі, канцэнтрацыю прамысловасьці і зьніжэньне сабекошту прадукцыі прамысловасьці.

Самым пільным парадкам захоўваць плянавасьць ва ўсім гаспадарчым будаўніцтве, адначасова забясьпечыўшы за мясцовымі арганізацыямі максымальную ініцыятыву.

Зараз жа прыступіць да прапрацоўкі пытаньня аб практычным пераходзе ў прамысловасьці БССР на сямігадзінны рабочы дзень.

ТАВАРАЗВАРОТ.

Зьезд адзначае значнае ўзмацненьне аграмаджанага сэктару ў таваразвароце (каапэрацыі і дзяржгандлю), за лік выцясьненьня прыватніка, што ўзмацовае змычку сацыялістычнай прамысловасьці з сялянскай гаспадаркай і забясьпечвае кіруючую ролю прамысловасьці ў народнай гаспадарцы Беларусі.

Зьезд адзначае выкананьне дырэктывы партыі аб зьніжэньні розьнічных цэн на 10 проц., што было праведзена пры актыўным удзеле шырокіх рабочых мас. У далейшым праца па зьніжэньні цэн павінна праводзіцца з неаслабнай энэргіяй і настойлівасьцю.

Неабходна ў далейшым яшчэ больш узмацніць работу па каапэраваньню рабочых і служачых у горадзе і сялянства ў вёсцы, і поўным зборы навых узносаў; неабходна адначасова палепшыць якасны падбор каапэрацыйных працаўнікоў, узмацніць каапэрацыйную грамадзкасьць і працу в каапэрацыйным актывам.

Зьезд даручае Цэнтральнаму Камітэту прыняць усе неабходныя захады па заданоленьню насельніцтва гораду, асабліва рабочых райёнаў, прадуктамі шырокага ўжываньня, а вёскі—прамысловымі таварамі.

МАТАР'ЯЛЬНЫ ДАБРАБЫТ РАБОЧАЙ КЛЯСЫ.

Зьезд канстатуе палепшаньне эканамічнага і бытавога становішча рабочай клясы на падставе агульнага ўздыму народнай гаспадаркі Беларусі, што найшло пацьвярджэньне ў росьце заработнай платы, узмацненьні кватэрнага будаўніцтва рабочых райёнаў, палепшаньні справы сацыялістычнага будаўніцтва і мэдыцынскага абслугоўваньня рабочых.

У той жа час неабходна адзначыць у гэтай галіне цэлы шэраг цяжкасьцяй, напр., павялічэньне беспрацоўя за кошт пастаяннага прыцёку лішкі рабочага насельніцтва з вёскі і падростаў з гораду, дарагоўля кватэрнага будаўніцтва, недахват устаноў па бытавому абслугоўваньню рабочых.

Зьезд даручае ЦК намеціць у далейшым мерапрыёмствы па паслабленьні беспрацоўя і павялічэньні дапамогі беспрацоўным; як і раней пашыраць рабочае кватэрнае будаўніцтва, дамагаючыся яго патаненьня; пашырыць сетку ўстаноў па бытавым абслугоўваньні рабочых і работніц, і надалей весьці рашэйшую лінію на павялічэньне заработнай платы рабочым у адпаведнасьці з ростам прадукцыйнасьці працы і агульным уздымам народнай гаспадаркі, дамагаючыся ў першую чаргу падцягваньня зарплаты адсталых груп рабочых.

КУЛЬТУРНАЕ БУДАЎНІЦТВА.

Побач з ростам палітычнае актыўнасьці рабочае клясы, зьезд канстатуе пашырэньне культурнага росту пралетарскіх мас Беларусі, які ўсё павялічваецца. Пашырэньне сеткі культурна-асьветных устаноў: клюбаў, хат-чытальняў і інш. сьведчыць аб культурным уздыме шырокіх рабочых і сялянскіх мас.

Адначасова зьезд канстатуе наліччa шэрагу значных недахопаў у гэтай важнейшай галіне працы: яшчэ нездавальняючую сетку культурна-асьветных устаноў, кепскае становішча клюбных памяшканьняў, нездавальняючую якасьць працы клюбаў. Зьезд даручае ЦК ужыць усе захады для зьніщчэньня гэтых недахопаў.

Побач з гэтым неабходна для больш шырокага задаволеньня растучых культурных попытаў рабочае клясы шырэй выкарыстаць у якасьці масавае прапаганды і перадачы ведаў друк, радыё, кіно і інш.

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА.

Зьезд канстатуе далейшыя посьпехі ў галіне разьвіцьця сельскае гаспадаркі, што характарызуецца ростам засеўнае плошчы, пашырэньнем тэхнічных культур і засеўных траў, разьвіцьцём жывёлаводзтва, пашырэньнем працы па зямляўпарадкаваньню і мэліярацыі, павялічэньнем дастаўкі вёсцы машын, насеньня, угнаеньня і інш.

На базе бязупыннага росту сельскае гаспадаркі ўмацоўваецца серадняцкая група вёскі; бядняцкая група, у тым ліку беззасеўная, дзякуючы эканамічнай дапамозе дзяржавы, зьмяншаецца з году ў год, пераходзячы ў значнай частцы ў серадняцкую групу. Гэты працэс, які адбываецца на беларускай вёсцы, з поўную бязумоўнасьцю пацьвярджае, што серадняк зьяўляецца цэнтральнаю фігураю земляробства.

Зьезд канстатуе наступовы рост аграмаджаных элемэнтаў у сельскай гаспадарцы, аднак, удзельная вага іх яму спыняе заставацца нязначнаю. Таму важнейшаю задачаю партыі на вёсцы застаецца няўхільнае ўмацаваньне і пашырэньне сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі, усямернае разгортваньне каапэраваньня сельскае гаспадаркі і разьвіцьцё яго калектыўных формаў.

У выніку разгорнутае правільнае арганізацыйнае, палітычнае і гаспадарчае працы сярод беднаты, вырасла актыўнасьць беднаты, умацаваўся бядняцка-серадняцкі блёк; адпор з боку гэтага блёку кулацкім элемэнтам вёскі робіцца ўсё больш арганізаваным, вырас аўтарытэт партыі ў шырокіх бядняцка-серадняцкіх масах вёскі, умацавалася аб'яднаньне іх навакол партыі і саветаў.

Зьезд лічыць, што далейшая праца сярод беднаты павінна складаць важнейшую задачу партыі на вёсцы.

Палітычны вопыт і гаспадарчая практыка КПБ з усёй рашучасьцю адхіляе завярэньне апазіцыі, што вынікам палітыкі партыі на вёсцы павінна зьявіцца: «бедняка зьнішчыць і серадняка не набыць".

НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ПЫТАНЬНЕ.

Зьезд адзначае шмат дасягненьняў у правядзеньні нацыянальнае палітыкі (пераход «Зьвязды» на беларускую мову, палепшаньне працы нацыянальных сельскіх саветаў, разгортваньне працы Інбелкульту, Навукова-Дасьледчага Інстытуту імя Леніна і інш. вышэйшых навучальных і навуковых устаноў).

Для забясьпечаньня далейшага посьпеху правядзеньня нацыянальнае палітыкі і далейшага разгортваньня культурнага будаўніцтва неабходна дамагчыся больш актыўнага ўдзелу КП(б)Б у правядзеньні нацыянальнай палітыкі, у першую чаргу ў правядзеньні беларусізацыі. Задача гэта асабліва востра стаіць перад прафсаюзамі.

Зьезд зьвяртае ўвагу на неабходнасьць далейшага ўцягваньня працоўных нацыянальных меншасьцяў у актыўнае савецкае і культурнае будаўніцтва і далейшае палепшаньне абслугоўваньня нацыянальных меншасьцяў праз нацыянальныя саветы і культурную працу на іх роднай мове.

Ня спыняючы барацьбу з праяўленьнямі нацыянал-дэмакратызму і шавінізму, зьезд зьвяртае асаблівую ўвагу на неабходнасьць рашучае барацьбы з антысэмітызмам, які вельмі часта служыць прыкрыцьцем дробна-буржуазных і контр-рэвалюцыйных настрояў і плыняў.

АБАРОНА КРАІНЫ.

КП(б) Беларусі за справаздачны пэрыяд значна павялічыла і ўзмацніла сваю ўвагу пытаньню абароназдольнасьці краіны.

Напружаныя міжнародныя абставіны СССР і пагроза ваеннага нападу патрабуюць, асабліва ва ўмовах прыгранічнасьці БССР, далейшае непаслабнае ўвагі Чырвонай арміі, культурнай і матар'яльнай дапамогі ёй, далейшаму значнаму ўзмацненьню працы па ўзьняцьці абарона-здольнасьці краіны.

Задачай КП(б)Б зьяўляецца яшчэ большае паглыбленьне працы па інфармаваньню шырокіх працоўных мас аб усіх зьменах у міжнародным становішчы Савецкага Саюзу, аб нарастаючай ваеннай небясьпецы з боку капіталістычных дзяржаў у адносінах да Савецкага Саюзу. Задачай КП(б)Б зьяўляецца таксама—ня лічачыся з бягучымі кон'юнктурнымі зьменамі, весьці сталую і неаслабную працу па арганізацыі мас для абароны краіны, узмацненьні працы ТДА-Авіяхіму, спартыўных стралковых гурткоў, арганізацыю дапрызыўнае падрыхтоўкі і г. д.

ПРАЦА САВЕТАЎ.

Адзначаючы дасягненьні ў правядзеньні кампаніі перавыбароў саветаў у 1927 годзе (рост актыўнасьці рабочых і вясковае беднаты, разгортваньне пралетарскае дэмакратыі). Зьезд лічыць, што ажыўленьне саветаў у далейшым застаецца найважнейшаю задачаю партыі.

У сувязі з надыходзячай у 1928 годзе кампаніяй па перавыбарах саветаў, неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на забясьпечаньне гэтае кампаніі патрэбным партыйным кіраўніцтвам, дамагаючыся далейшага ўзмацненьня ў іх партыйна-пралетарскага ўплыву. Праца па ажыўленьню і ўзмацненьню дзейнасьці саветаў павінна праводзіцца шляхам узмацненьня кіраўніцтва саветамі, паглыбленьня працы пленумаў і сэкцый, энэргічнага вылучэньня рабочых, батракоў і беднаты і лепшых сераднякоў у кіруючыя органы, памятуючы, што ажыўленьне саветаў узмацняе дыктатуру пралетарыяту, зьяўляецца аднэй з галоўных умоў для далейшага пашырэньня сацыялістычнага будаўніцтва, узмацненьня саюзу рабочае клясы і сялянства і рашучае барацьбы з бюракратызмам.

Зьезд адзначае невыстарчальнае ўцягненьне работніц у саветы і зьніжэньне процанту сялянак у сельскіх саветах і прапануе да надыходзячае перавыбарчае кампаніі ўзмацніць увагу КП(б)Б да пытаньняў большага ўцягненьня работніц і сялянак у саветы. Адначасова зьезд даручае зьвярнуць больш увагі на ўцягненьне жанчын у кіруючыя органы, каапэрацыі, прафсаюзаў і г. д.

ПРАЦА СЯРОД ЖАНЧЫН.

Адзначаючы дасягненьні па працы сярод працоўных жанчын, палепшаньне партыйнага кіраўніцтва працаю сярод работніц і сялянак, палепшаньне працы дэлегацкіх сходаў, некаторыя посьпехі ў галіне прасоўваньня жаночае працы ў вытворчасьць, рост актыўнасьці работніц і сялянак і палепшаньне іх бытавога абслугоўваньня,—зьезд прапануе палепшыць якасьць працы дэлегацкіх сходаў, галоўным чынам, у напрамку павялічэньня ўдзелу як усіх дэлегацкіх сходаў, так і асобных дэлегатак у практычнай грамадзкай працы, замацаваўшы дасягненьні ў галіне прасоўваньня работніцы ў вытворчасьць і разам з ростам прамысловасьці імкнуцца павышаць удзельную вагу ў вытворчасьці; павялічыць працу па ўзьняцьцю кваліфікацыі жаночае працы, зьвярнуўшы ўвагу на барацьбу з жаночым беспрацоўем.

КАМСАМОЛ.

Зьезд сьцьвярджае аб'яднаньне шэрагаў камсамолу навакол партыі і яе бальшавіцкага кіраўніцтва і аднагоднае падтрыманьне лініі партыі ўсёй камсамольскай арганізацыяй. Дружны адпор, дадзены ўсім камсамолам агідным выпадам трацкісцкае апазіцыі проці партыі, адхіленьне дэмагогіі апазіцыі аб пагоршаньні становішча рабочае моладзі,—характарызуюць у патрэбнай меры ідэёвую ўстойлівасьць і здаровы стан камсамолу.

У мэтах далейшага ўмацаваньня шэрагаў камсамолу, зьезд лічыць неабходным зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу пытаньням правільнага партыйнага кіраўніцтва, павялічэньню партыйнага ядра ў камсамоле, шляхам узмоцненага ўцягненьня ў партыю рабочых камсамольцаў. Асаблівую ўвагу неабходна зьвярнуць пытаньню правільнага рэгуляваньня росту камсамолу за кошт рабочае моладзі на вытворчасьці, бядняцка-батрацкай і лепшае часткі серадняцкае моладзі на вёсцы. Адначасова неабходна стала імкнуцца да далейшага палепшаньня матар'яльнага становішча рабочае моладзі, аказваючы самую актыўную дапамогу і падтрыманьне ўзьняцьцю палітычнага і культурнага ўзроўню камсамолу і ўсёй рабочай моладзі.

Адзначаючы паслабленьне ўвагі піянэрскаму руху, зьезд даручае ЦК ўсім партыйным арганізацыям узмацніць кіраўніцтва і аказваць максымальную дапамогу піянэрскім арганізацыям у іх росьце.

УНУТРЫПАРТЫЙНАЯ ПРАЦА.

Зьезд адзначае правільную лінію ЦК у галіне рэгуляваньня росту і сацыяльнага складу партыйнае арганізацыі, накіраваную ў бок павялічэньня пралетарскага ядра ў складзе КП(б)Б. Адзначаючы невыстарчальнасьць тэмпу росту за мінулы пэрыяд, зьезд прызнае неабходным узмацніць працу ўсіх арганізацый па сыстэматычнаму ўцягненьню рабочых ад варштату ў партыю і батракоў на вёсцы, не паслабляючы ўвагі ўсіх партыйных органаў да пытаньня аб рэгуляваньні сацыяльнага складу.

Зьвяртаючы асаблівую ўвагу на прадпрыёмствы, дзе партыйная праслойка сярод агульнае масы рабочых яшчэ не здавальняюча, зьезд адзначае нязначны прыток работніц у партыю і прапануе ўзмацніць працу ў гэтым напрамку, асабліва на прадпрыёмствах з вялікаю колькасьцю работніц.

Значны прыток рабочых у партыю ў апошні пэрыяд ставіць перад усёй КПБ вельмі важную задачу па выхоўваньню новых кадраў і ўцягненьня іх у практычную працу.

Зьезд канстатуе далейшае разьвіцьцё ў КП(б)Б унутрыпартыйнай дэмакратыі, што выяўляецца ў значным узмацненьні актыўнасьці партыйнай масы, значным палітычным росьце і згуртаванасьці ўсіх партарганізацый. За мінулы пэрыяд узмацнілася і справаздачнасьць выбарных органаў перад партыйнымі масамі, узмацнілася абгаварэньне ўнутрыпартыйнага становішча, самыя шырокія партыйныя масы прыцягваліся да абгаварэньня важнейшых пытаньняў і пастаноў партыі, сурова захоўвалася выбарнасьць партыйных органаў і службовых асоб.

Усё гэта цалкам і поўнасьцю адхіляе паклёпны тэзіс трацкісцкай апазіцыі адносна замірэньня партыйнага жыцьця, пасыўнасьці, аб апаратным зажыме і г. д. і характэрызуе поўны адрыў апазіцыі ад партыйнага жыцьця і шырокіх партыйных мас.

Зьезд даручае ЦК і ў далейшым зьвяртаць асаблівую ўвагу пытаньню далейшага пашырэньня ўнутрыпартыйнай дэмакратыі шляхам своячасовай і поўнай інфармацыі партыйных арганізацый па ўсіх пытаньнях унутрыпартыйнага жыцьця, яшчэ большага ўзьняцьця актыўнасьці партыйных мас, далейшага ўзмацненьня працы па вылучэньню партыйцаў-рабочых ад варстату на кіруючую працу і яшчэ большаму паглыбленьню партыйна-выхоўваючай працы сярод шырокіх партыйных мас.

Зьезд адзначае вялікую працу, праведзеную ўсёй КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК па згуртаваньню ўнутрыпартыйных шэрагаў і ўсваеньню ўсёй партарганізацыяй меншавіцкай сутнасьці трацкісцкай апазіцыі канчаткова парваўшай з ленінізмам.

Вялікая актыўнасьць, выяўленая ўсімі партарганізацыямі пры правядзеньні дыскусіі, значны палітычны рост, поўны ідэёва-палітычны разгром апазіцыі, злучэньне шэрагаў партыі навакол ленінскага кіраўніцтва,—усё гэта сьведчыць аб ідэёвай згуртаванасьці і ўстойлівасьці ўсёй КП(б)Б.

Зьезд з вялікім задавальненьнем адзначае, што ня толькі ў шэрагах КПБ, але і ў шэрагах усяго пралетарыяту і працоўных Беларусі апазіцыя ня мае ніякай апоры, што на паклёп апазіцыі ўся рабочая кляса дружна і аднадушна адказала ўступленьнем у партыю перадавых рабочых, яшчэ большым згуртаваньнем сваіх шэрагаў навакол нашай партыі і правадзімай ёю палітычнай лініі.

Ухваляючы цалкам усе мерапрыёмствы, праведзеныя ЦК па згуртаваньні адзінства ў шэрагах партыі і недапушчэньня дэзарганізатарскай раскольніцкай працы апазіцыі, XI зьезд КП(б)Б прапануе ЦК і ўсім партыйным арганізацыям не паслабляць працы па яшчэ больш ідэёваму аб'яднаньню партыі і канчатковай перамозе апазіцыі. Для гэтае мэты зьезд прызнае неабходным праводзіць узмоцненую выхаваўчую працу, энэргічна растлумачваючы ўвесь палітычны бок меншавіцка-трацкісцкай апазіцыі, ня спыняючыся перад выключэньнем з партыі ўсіх тых, хто парваў з партыяй і хто праводзіць фракцыйную працу, накіраваную на парушэньне партыйнага адзінства і заснаваньне новай трацкісцкай партыі.

XI зьезд КП(б)Б з усёй рашучасьцю заяўляе, што не пацерпіць у сваіх шэрагах тых, хто па сутнасьці парваў з ленінскай партыяй і ленінізмам, тых, хто сваёй раскольніцкай антыпартыйнай працай вядзе лінію на заснаваньне другой партыі, на падрыў дыктатуры пралетарыяту, грае ў руку «трэцяй сіле» і робіцца сьцягам для ўсіх контр-рэвалюцыйных сіл.

Уся КП(б)Б пераканана, што 15-ы зьезд УссКП(б) будзе найвялікшай дэманстрацыяй сапраўднага адзінства і згуртаванасьці бальшавіцкіх шэрагаў нашай партыі.

На падставе яго пастаноў уся КП(б)Б будзе таксама цьвёрда і ўпэўнена стаяць на варце адзінства нашае партыі.

Тыраж пазыкі 1926 году.

АФІЦЫЙНАЯ ТАБЛІЦА

У тыражу выйгрышаў дзяржаўнай выйгрышнай пазыкі 1926 г., які адбыўся ў г. Менску 1-га сьнежня 1927 году.

На ранішнім і вячэрнім пасяджэньнях 1-га сьнежня г. г. тыражнай камісіяй разыграна:

850	выйгрышаў	па	200	рублёў	5	выйгрышаў	на 10000 рублёў
250	«	«	300	«	3	«	« 25000 «
79	«	«	1000	«	2	«	« 50000 «
10	«	«	5000	«	1	«	у 100000 «

Апроч таго, тыражавана 9.800 аблігацый па іх намінальным кошце, г. зн. па 100 рублёў за цэлую аблігацыю і па 25 рублёў за кожную чвэрць яе.

На ранішнім пасяджэньні выйгрышы прыпалі па ўсіх 50-ці нумарох аблігацый на наступныя сэрыі:

па 200 рублёў

0.412 0.848 1.100 1.855 3.216 4.062 4.093 4.507 5.980
0.687 0.945 1.798 2.203 3.425 4·070 4.113 4.976

па 300 рублёў

0.234 2.832 3.110 4.039 5.346

На вячэрнім пасяджэньні выгрышы прыпалі на наступныя №№ сэрый і аблігацый.

па 1.000 рублёў

№№ сэрый.	№№ абл.	№№ сэрый.	№№ абл.	№№ сэрый.	№№ абл.	№№ сэрый.	№№ абл.	№№ сэрый.	№№ абл.
0.092	37	1.633	10	3.274	35	4.548	9	5.842	30
0.213	42	1.814	10	3.306	29	4.562	49	5.879	22
0.225	12	1.846	25	3.334	33	4.892	4	5.888	38
0.374	9	2.075	6	3.353	31	4.983	31	5.927	5
0.391	32	2.292	33	3.359	3	5.021	25	5.943	27
0.394	18	2.363	41	3.427	11	5.052	9	5.962	46
0.560	35	2.390	44	3.475	45	5.168	4	5.999	5
0.577	37	2.494	35	3.560	37	5.246	30		
0.683	18	2.518	36	3.701	38	5.322	7		
0.853	46	2.552	3	3·780	27	5.366	27		
0.864	24	2.573	9	3.827	23	5.415	8		
0.870	26	2.597	41	3.926	20	5.417	28		
0.933	1	2.602	43	4.036	4	5.484	27		
1.336	31	2.612	2	4.200	27	5.551	16		
1.461	24	2.698	3	4.211	28	5.701	14		
1.491	2	2.702	16	4.286	8	5.728	43		
1.530	47	3.144	21	4.411	10	5.780	8		
1.592	25	3.149	46	4.539	48	5.809	4		

па 5.000 рублёў

0.422	26	0.669	15	3.243	37	4.216	7	5.569	10
0.520	38	0.989	38	3.986	28	5.215	45	5.849	47

па 10.000 рублёў

1.903	49	3.463	19	3.739	42	4.566	22	4.999	41

па 25.000 рублёў

0.304	44	1.353	7	5.456	16

па 50.000 рублёў.

3.026	15	4.502	43

па 100.000 рублёў.

4.401	4

Тыражаваныя №№ аблігацый з выплатаю па іх намінальным кошце, г. зн. па 100 руб. за цэлую аблігацыю і па 25 руб. за кожную чвэрць яе:

№№ сэрый	№ абл.	№№ сэрый	№ абл.	№№ сэрый	№ абл.
0.092	1—36, 38—50	2.363	1—40, 42—50	4.286	1— 7, 9—50
0.213	1—41, 43—50	2.390	1—43, 45—50	4.302	1—50
0.225	1—11, 13—50	2.416	1—50	4.401	1— 3, 5—50
0.268	1—50	2.456	1—50	4.411	1— 9, 11—50
0.304	1—43, 45—50	2.488	1—50	4.420	1—50
0.327	1—50	2.491	1—50	4.441	1—50
0.374	1— 8, 10—50	2.494	1—34, 36—50	4.502	1—42, 44—50
0.391	1—31, 33—50	2.518	1—35, 37—50	4.539	1—47, 49—50
0.394	1—17, 19—50	2.552	1— 2, 4—50	4.548	1— 8, 10—50
0.396	1—50	2.563	1—50	4.562	0—48, — 50
0.422	1—25, 27—50	2.573	1— 8, 10—50	4.566	1—21, 23—50
0.496	1—50	2.597	1—40, 42—50	4.634	1—50
0.510	1—50	2.602	1—42, 44—40	4.670	1—50
0.520	1—37, 39—50	2.605	1—50	4.696	1—50
0.565	1—34, 36—50	2.612	0— 1, 3—50	4.799	1—50
0.566	1—50	2.646	1—50	4.892	1— 3, 5—50
0.577	1—36, 38—50	2.662	1—50	4.899	1—50
0.603	1—50	2.698	1— 2, 4—50	4.929	1—50
0.649	1—50	2.702	1—15, 17—50	4.964	1—50
0.669	1—14, 16—50	2.724	1—50	4.983	1—30, 32—50
0.683	1—17, 19—50	2.725	1—50	4.999	1—40, 42—50
0.700	1—50	2.825	1—50	5.014	1—50
0.712	1—50	2.855	1—50	5.021	1—24, 26—50
0.789	1—50	2.899	1—50	5.052	1— 8, 10—50
0.853	1—45, 47—50	2.999	1—50	5.053	1—50
0.864	1—23, 25—50	3.026	1—14, 16—50	6.060	1—50
0.870	1—25, 27—50	3.113	1—50	5.084	1—50
0.933	2—50	3.144	1—20, 22—50	5.168	1— 3, 5—50
0.940	1—50	3.149	1—45, 47—50	5.202	1—50
0.989	1—37, 39—50	3.243	1—36, 38—50	5.215	1—44, 46—50
1.110	1—50	3.255	1—50	5.246	1—29, 31—50
1.176	1—50	3.264	1—50	5.258	1—50
1.181	1—50	3.274	1—34, 36—50	5.322	1— 6, 8—50
1.182	1—50	3.306	1—28, 30—50	5.366	1—26, 28—50
1.186	1—50	3.334	1—32, 34—50	5.393	1—50
1.302	1—50	3.338	1—50	5.408	1—50
1.336	1—30, 32—50	3.353	1—30, 32—50	5.415	1— 7, 9—50
1.342	1—50	3.357	1—50	5.417	1—27, 29—50
1.353	1— 6, 8—50	3.359	1— 2, 4—50	5.423	1—50
1.381	1—50	3.361	1—50	5.427	1—50
1.461	1—23, 25—50	3.409	1—50	5.450	1—50
1.491	0— 1, 3—50	3.424	1—50	5.456	1—15, 17—50
1.525	1—50	3.427	1— 10, 12—50	5.484	1—26, 28—50
1.530	1—46, 48—50	3.463	1—18, 20—50	5.551	1—15, 17—50
1.576	1—50	3.475	1—44, 46—50	5.569	1— 9, 11—50
1.592	1—24, 26—50	3.511	1—50	5.600	1—50
1.598	1—50	3.560	1—36, 38—50	5.670	1—50
1.633	1— 9, 11—50	3.585	1—50	5.701	1—13, 15—50
1.637	1—50	8.588	1—50	5.728	1—42, 44—50
1.662	1—50	3.701	1—37, 39—50	5.740	1—50
1.693	1—50	3.739	1—41, 43—50	5.755	1—50
1.762	1—50	3.780	1—26, 28—50	5.780	1— 7, 9—50
1.814	1— 9, 11—50	3.807	1—50	5.787	1—50
1.820	1—50	3.814	1—50	5.809	1— 3, 5—50
1.823	1—50	3.827	1—22, 24—50	5.842	1—29, 31—50
1.846	1—24, 26—50	3.854	1—50	5.849	1—46, 48—50
1.858	1—50	3.926	1—19, 21—50	5.879	1—21, 23—50
1.903	1—48,— 50	3.951	1—50	5.882	1—50
1.918	1—50	3.973	1—50	5.888	1—37, 39—50
1.957	1—50	3.986	1—27, 29—50	5.920	1—50
2.044	1—50	4.036	1— 3, 5—50	5.927	1— 4, 6—50
2.075	1— 5, 7—50	4.200	1—26, 28—50	5.943	1—26, 28—50
2.088	1—50	4.211	1—27, 29—50	5.962	1—45, 47—50
2.152	1—50	4.216	1— 6, 8—50	5.968	1—50
2.172	1—50	4.218	1—50	5.999	1— 4, 6—50
2.292	1—32, 34—50	4.279	1—50		
2.314	1—50				

Выплата выйгрышаў у 200 і 300 руб., а таксама выплата намінальнага кошту тыражаваных аблігацый робіцца фінорганамі, установамі Дзяржбанку і касамі ашчаднасьці праз тры дні пасьля атрыманьня на месцы газэт «Известия ЦИК СССР и ВЦИК» і «Савецкая Беларусь», у якіх зьмешчана данная афіцыйная табліца.

Выплата выйгрышаў у 1.000 руб. і больш, як па цэлых аблігацыях, так і па асобных яе частках робіцца ўправаю Дзяржбанку ў Маскве. Прыём заяў аб выплаце буйных выйгрышаў з далучанымі да заяў аблігацыямі для пасылкі іх у ўправу Дзяржбанку робіцца ўсімі ўстановамі Дзяржбанку, касамі Наркамфіну і касамі ашчаднасьці. Па іншых аблігацыях, якія выйшлі ў тыраж, выплата належачых сум робіцца ўсімі ўстановамі Дзяржбанку, касамі Наркамфіну і касамі ашчаднасьці.

Старшыня Тыражнай Камісіі Нарком Унутраных Спраў і сябра ЦВК БССР **СТАШЭЎСКІ.**

Намесьнікі старшыні Тыражнай камісіі:

прадстаўнік НКФ СССР **ТАМАРКІН.**

прадстаўнік НКФ БССР **АБРАМСОН.**

Перад розыгрышам.

Ужо зранку каля будынку і ў самым будынку Беларускага Дзяржаўнага Тэатру шмат народу.

Каля кіёскаў Дзяржбанку і касы ашчаднасьці—чарга: сьпяшаюцца набыць аблігацыі пазыкі. Тут-ж на месцы каса ашчаднасьці прымае і страхоўку аблігацыяў.

Набываюць больш чверткі аблігацыяў—гэта ідзе дробны трымацель пазыкі. Пападаецца і буйны—з менскіх нэпманаў, які адразу купляе па некалькі сот рублёў...

Каля справачных сталоў увесь час ватоўп народу,—правяраюць, ці ня выйгралі яны ў мінулыя тыражы...

* * *

На выстаўцы Наркамфіну шмат цікавага. Зварачваюць на сябе ўвагу макеты, малюючыя тыражы савецкіх пазык і часоў царскага ладу.

Ідзем далей,—здымкі алмазнага фонду,—тут і кароны і іншыя рэчы, каштоўнасьць на мільёны рублёў.

Цікава паглядзець і грашовыя знакі. Царскія, керанкі, белагвардзейскія,—якіх толькі ня

На Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

АЖЫЎЛЕНЬНЕ КЛЮБНАЕ ПРАЦЫ.

Гомель, 1-XII. У сучасны момант акрузе праводзіцца кампанія перавыбараў праўленьняў клюбаў. Уся праца па перавыбарах праходзіць пад лёзунгам замацаваньня дасягненьняў, пошукаў ёсьць у клюбнай працы, і ўцягненьня новых членаў клюбу. Асаблівая ўвага зьвяртаецца на ўцягваньне членаў клюбаў жон рабочых.

Сялянную масу шырока інфармуюць пра наступаючыя перавыбарах. Для гэтага выкарыстоўваюцца чарговыя сяльныя і дэлегацкія сходы. У клюбах, прадпрыёмствах, установах і ў цэнтрах вывешваюцца плякаты з кароткай справаздачай аб працы праўленьняў клюбаў.

Даклады праўленьняў клюбаў жвава абгаварваюцца. Рабочыя адзначаюць асобныя недахваты ў клюбнай працы. Галоўным чынам зьвяртаецца ўвага на пытаньні лепшага абслугоўваньня. Клюб павінен быць сапраўдным месцам для адпачынку насьля працоўнага дня. Розныя халтурныя тэатральныя пастаноўкі павінны быць выжыты са сцэны рабочага клюбу.

Перавыбарная кампанія праўленьняў клюбаў скончыцца ў акрузе да 5 сьнежня.

УЗМАЦНЕНЬНЕ КАЛЕКТЫЎНЫХ ГАСПАДАРАК.

Віцебск, 1-XII. Сельбанк на крэдытаваньне калектыўных гаспадарак у першы квартал гэтага году адпусьціў 25.000 руб.. Калектыўным гаспадаркам дасцца 5-цігадовы крэдыт.

Акрыканком стварыў камісію па перадачы калектыўным гаспадаркам акругі дзяржаўнае зямельнае маемасьці. Будзе перададзена маемасьці на суму 500.000 руб.

НОВЫ СМАЛАКУРНЫ ЗАВОД.

Сьмілавічы, 1-XII. У Бязбожнай вёсцы закончана пабудова новага смалакурнага заводу. Завод амаль поўнасьцю абсталёван і ў хуткім часе мае распачаць працу.

РЭАЛІЗАЦЫЯ БІЛЕТАЎ АВІЯЦЫЙНАЕ ЛЁТАРЭІ.

Віцебск, 1-XII. Віцебскае аддзяленьне ТДА-Авіяхіму атрымала 8.300 білетаў другой асесаўнай авіяцыйнай лётарэі. Гэтыя білеты бадай поўнасьцю рэалізаваны. ТДА-Авіяхіму атрымала яшчэ 1.500 лётарэйных білетаў.

САМАЛЁТ «ПАЛЯЎНІЧЫ БЕЛАРУСІ».

Віцебск, 1-XII. На ініцыятыве межмыскага калектыву паляўнічых пачаўся сбор сродкаў на самалёт «Паляўнічы Беларусі». Межанцы, якія першымі ўнесьлі 14 р. 40 к., выклікалі адначасова шэраг іншых калектываў. Суражскі калектыў вынес пастанову аб унясеньні кожным паляўнічым адной скуры (заяц ці белка) на карысьць пабудовы самалёту. Акруговае праўленьне паляўнічых адлічыла па самалёт 100 руб.

РОСТ АШЧАДНАСЬЦІ.

Магілеў, 1-XII. За год лік укладчыкаў кас ашчаднасьці вырас у два разы, а сума ўкладаў павялічылася больш, чымся ў чатыры разы. На 1 кастрычніка 1926 году было 2528 укладчыкаў на суму 117 з паловай тысяч руб., а на 1 кастрычніка гэтага году—5650 укладчыкаў на 518 тысяч рублёў. Вёска павялічыла ўкладаў удвая больш, чымся горад. У «двухтыднёвік ашчаднасьці» ўцягнуты амаль выключна сяляне-ўкладчыкі: вёска дала 1000 новых укладчыкаў на 80 тысяч рублёў.

КРЭДЫТНАЙ ДАПАМОЗЕ НАСЕЛЬНІЦТВУ ПРЫ ЗЕМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНІ.

Дрыкапалосіца і правапалосіца, забытанасьць зямельных адносін і іншыя недахопы старых формаў землярыстаньня найбольш перашкаджаюць разьвіцьцю малазямельных (бядняцкіх) гаспадарак і найбольш цяжка адбіваюцца на іх становішчы. Беднота гэта разумела і таму яна зьяўляецца амаль што заўсёды ініцыятарам землянарадкаваньня. Найвялікшы эфэкт ад правядзеньня земляўпарадкаваньня атрымоўваецца дзеля малазямельных гаспадарак, але толькі пры ўмове, што гэтыя гаспадаркі атрымаюць своячасова неабходную суму грошай у доўгатэрміновую пазыку на перапос будынкаў, пабудову калодзежа, набыцьцё інвэнтару, жывёлы і г. д. Без крэдытнай дапамогі земляўпарадкаваньне бядняк-гаспадарак ня толькі ня дасьць чакаемага эканамічнага эфэкту, а наадварот—можа прывесьці іх у становішча яшчэ больш дрэннае, чымся тое, у якім яны былі да правядзеньня земляўпарадкаваньня, бо вялікія выдаткі, зьвязаныя з пераездам на новае мейсца і з перабудовай гаспадаркі могуць доўга не дадуць ёй магчымасьці разьвіць вытворчыя сілы. Па доўгатэрміновае крэдытаваньне земляўпарадкаваемага насельніцтва дзяржава адпускае значныя сумы.

Так, на бягучы 1927-28 бюджэтны год адпушчана па рэспубліцы з надзвычайнага бюджэту 600.000 руб. і са сродкаў Белсельбанку 900.000 руб. Акрача гэтага, дзеля крэдытаваньня на набыцьцё лесаматар'ялаў адпушчана 750.000 руб.

Гэтыя сродкі даюць магчымасьць задаволіць патрэбы бяднейшага земляўпарадкаваемага насельніцтва. Але неабходна, каб мясцовыя саветы, а таксама земляўпарадкавацелі цікавіліся правільнасьцю скарыстаньня крэдытных сродкаў.

Яны абавязаны растлумачыць насельніцтву парадак і ўмовы атрыманьня крэдытаў, выявіць гаспадаркі, найбольш адчуваючыя патрэбу ў крэдыце, а таксама наглядаць за тым, каб сумы крэдытнай дапамогі на адну гаспадарку давалі магчымасьць выканаць яе перабудаваньне, а не распылялися па 10-20 руб. паміж вялікай колькасьцю гаспадарак.

Тут неабходна ўзяць рашучы курс на капітальнае ўлажэньне ў гаспадарку, бо толькі такім чынам можна яе паставіць на ногі і атрымаць жадаемы эканамічны эфэкт.

Зямельныя аддзелы РВК таксама павінны цікавіцца гэтай справай. Яны павінны даваць папярэднія заўкі на неабходныя для райёну сумы, і загадчыкі іх павінны прысутнічаць на пасяджэньнях крэдытных таварыстваў пры абгаварэньні пытаньняў аб здаволеньні заявак на крэдыт земляўпарадкаваемага насельніцтва.

Найбольш пажаданым было-б, каб бядняцкія гаспадаркі арганізоўваліся дзеля атрыманьня і скарыстаньня крэдытаў у групы і набывалі некаторыя машыны, як, скажам, малатарня, арфа, цэлай групай у 10—15 чалавек. Гэта, з аднаго боку, дало-б гаспадарцы магчымасьць перабудавацца з меншымі стратамі, і з другога боку—дало-б магчымасьць набыць такія машыны, якія не пад сілу адзіночнай гаспадарцы.

Тут-жа неабходна адзначыць, што вялікай перашкодай для беднякоў пры атрыманьні крэдыту зьяўляецца неабходнасьць забясьпечаньня яго маемасьцю, альбо паручыцельствам і ўнясеньне ў таварыства паю.

Белсельбанку трэба перагледзіць існуючы парадак выдачы крэдытаў і даць беднаце некаторыя ільготы, а бядняцкія групы, якія атрымоўваюць крэдыт калектыўна, зусім вызваліць ад забясьпечаньня крэдытаў маемасьцю.

А. К.

НА ВАРЦЕ КРАІНЫ САВЕТАЎ.

Дапрызыўнік! Сумленна і сьвядома вывучай вайскова-палітычную справу. Рыхтуйся стаць у шэрагі чырвоных байцоў.

20 сьнежня—10-годзьдзе ВЧК—АДПУ.

З году ў год усьлед за гадавінай Кастрычніцкавай рэвалюцыі мы адзначаем гадавіну нязьменнага вартаўніка дыктатуры пралетарыяту — органаў ВЧК-АДПУ. 20 сьнежня 1917 г. дэкратам Савнаркому была ўтворана Надзвычайная Камісія па барацьбе з контр-рэвалюцыяй, сабатажам і спэкуляцыяй.

І з тых часоў разам са згібамі рэвалюцыйнага шляху—грамадзянская вайна, вайсковы камунізм, новая эканамічная палітыка—мяняліся і задачы ЧК—АДПУ. ЧК прасьледуе контр-рэвалюцыю, распраўляецца з ёю. ДПУ азначае пераход (6 сьнежня 1922 г.) на другія рэйкі працы. Але ДПУ, як і ВЧК, сачыць за кожным крокам контр-рэвалюцыі ўнутры краіны, ДПУ ахоўвае наша эканамічнае будаўніцтва, за ДПУ захавана права ў патрэбных выпадках непасрэдна караць контр-рэвалюцыянэраў, спэкулянтаў і іншых злосных ворагаў рэвалюцыі.

ДПУ і на гэты дзень выклікае дзікую злосьць у эксплёататарскіх клясах капіталістычных краін. ДПУ—сябра і апора працоўных. Іменна падтрыманьнем і дапамогай шырокіх рабочых і сялянскіх мас і магутны орган АДПУ. (Напрыклад, ня вельмі даўная апэрацыя па затрыманьню шпіёна Аперпута і яго кампаніі ў нашай БВ Акрузе ўдалася дзякуючы дапамозе сялян).

Сваё дзесяцігодзьдзе органы ВЧК-АДПУ спраўляюць разам з гвардыяй пралетарыяту—войскамі АДПУ. Насьля рэарганізацыі органаў ЧК былі рэарганізаваны пагранічныя часьці, якія перайшлі пад кіраўніцтва Наркам'унуспраў і ДПУ. Гэты пераход высунуў агрэмадную задачу—**выхаваць новыя кадры** для спэцыяльнай працы.

І вось, дзякуючы высунутаму ў свой час лёзунгу—вращчваньня органаў і войск АДПУ—мы з году ў год маем усё лепшага і лепшага воіна-чакіста—грамадзяніна. І шмат таварышоў з шэрагаў пагран-аховы і войск АДПУ замяняюць стомленых на нечалавечай працы ў органах АДПУ чакістаў.

Дзесяцігодзьдзе ВЧК-АДПУ ёсьць у першую чаргу сьвята працаўнікоў і байцоў ДПУ. Да 10 гадавіны будуць падагулены вынікі гэраічнай працы ВЧК-АДПУ на захаваньню і ўзмацненьню дыктатуры пралетарыяту. У дзень 10-хгодзьдзя будуць таксама намечаны дакладныя задачы далейшай працы чакістаў.

Міжнародная абстаноўка не паляпшаецца, а ўскладняецца, абвастраецца. А гэта значыць, што і роля ДПУ ўнутры краіны яшчэ больш павялічваецца. Шпіёны ізноў робяць спробы перашагнуць нашу мяжу. Значыць, пост пагранічніка і чырвонаармейца-чакіста патрабуюць бязупыннай увагі і адказнасьці.

Вось чаму—яшчэ больш пастарожнасьці і ўвагі да аховы мяжы з боку чырвонаармейцаў 1904 г. і «старыкоў» 1903 г.; 100-процантнай увагі і сур'ёзнасьці да падрыхтоўкі з боку маладняка,—такі павінен быць наш чакісцкі падарунак к 10-годзьдзю ВЧК-АДПУ.

І. В.

Мацнее сувязь з вінтоўкай.

(Менск, БДУ).

З пачаткам новага 1927-28 вучэбнага году вайсковыя заняткі ў БДУ на ўсіх факультэтах разгарнуліся шырокім фронтам. У мэтах практычнай дапамогі пры правядзеньні стральбы 6 стралковы прыняў шэфства над БДУ

Вайсковыя заняткі ў БДУ маюць тэарытэчны і практычны характар. Да тэарэтычных ведаў адносяцца тактыка, вайсковая адміністрацыя і топаграфія, а да практычных заняткаў адносіцца стральба і азнаямленьне з строем. Пры гэтым трэба заўважыць, што стральбу кожны студэнт павінен прайсьці ў па-за вучэбны час шляхам экскурсій у 6 стр. полк і ў вайсковыя часткі Чырвонай арміі. Гэткіх экскурсій намечана за зімовы час правесьці 6.

Студэнцтва павінна быць азнаёмлена з бытам Чырвонай арміі і вайсковай тэхнікай.

Ужо некалькі такіх экскурсій праведзена было ў Беларускую Аб'яднаную Вайсковую школу, якія далі добрыя вынікі, бо на іх студэнты азнаёміліся з кулямётамі і навучыліся страляць з іх.

Да гэтай працы прыцягнута 12 асоб, пераважна з камандныга складу Белар. Аб'яд. Вайсковай школы імя ЦВК і асобы рыцэйчага камандныга складу з частак гарнізону з пэдагагічным стажам. Ваенізацыяй у БДУ ахоплена звыш 2.500 студэнтаў і студэнтак.

Вайсковы габінэт зьяўляецца матар'яльнай базай для замацаваньня тых ведаў, якія студэнты атрымліваюць у працэсе заняткаў. У габінэце маецца шмат вайсковай літаратуры, плякатаў, схэмаў, маюцца кулямёты, вінтоўкі супроцьгазы і інш.

Вялізарную ролю ў сэнсе ваенізацыі ў БДУ адыгравае і яч. ТДА—Авіяхім, якая яднае ў сваіх шэрагах да 800 сяброў.

Ячэйка мае розныя гурткі, як стралковы, хімічная каманда, гурток сувязі, хімічны гурток, санітарны гурток, у які ўваходзяць выключна студэнткі, ёсьць яшчэ паляўнічы гурток, лыжны, падрыўны і інш. Гурткі амаль што кожны тыдзень з посьпехам праводзяць свае заняткі.

Некаторыя гурткі займаюцца ў Доме Чырвонай арміі.

У мэтах наладжваньня справы ваенізацыі ў насьценных газэтах на факультэтах існуюць з сёлетняга году вайсковыя куткі.

Наогул, студэнтам родным і блізкім стала стракатаньне «Максіма» і вінтоўкі—кніга ўсё больш і больш замацоўвае з імі моцную сувязь.

Л.

1 сьнежня пачалася дапрызпадрыхтоўка.

Як яна будзе праводзіцца ў гэтым годзе.

Штабам Беларускай Вайсковай Акругі дадзены ўказаньні тэрытарыяльным упраўленьням і тэрчасьцям аб правядзеньні ў гэтым годзе дапрызыўнай падрыхтоўкі і пазавайсковай падрыхтоўкі.

Пачатак дапрызпадрыхтоўкі—1 сьнежня. У пэрыяд з 1 сьнежня да 1 красавіка па дапрызыўных пунктах будзе праведзена навучаньне некалькіх чарод дапрызыўнікаў і ў апошнюю чаргу—пазавайсковікаў.

У першую чаргу будзе прыступлена да навучаньня дапрызыўнікаў 1906 г. У райёне тэратарыяльных часьцей, дзе 1906 год у мінулым годзе ўжо праходзіў дапрызпадрыхтоўку, у гэтым годзе дапрызыўнікі будуць навучацца ў працягу 24 вучэбных дзён, разьлічаных на 180-гадзінную праграму. У тых райёнах, дзе 1906 год яшчэ не праходзіў дапрызпадрыхтоўкі, ён будзе навучацца ў працягу 32 дзён па праграме, разьлічанай на 240 гадзін.

На дапрызпунктах пры пяхотных часьцях галоўная ўвага будзе зварачвацца на стралковую падрыхтоўку, тактычную, страявую, спэцыяльную падрыхтоўку, палітпадрыхтоўку і вывучэньне аружжа.

Усяго-ж дапрызыўнікі будуць праходзіць наступныя 10 дысцыплін: палітпадрыхтоўка, вывучэньне ўстава, санпадрыхтоўка, фізпадрыхтоўка, вайсковахімічная справа, аружжа і яго зьберажэньне, стралковая падрыхтоўка, уладаньне халодным аружжам, тактычна-страявая падрыхтоўка і спэцпадрыхтоўка.

У гэтым годзе харчаваньне дапрызыўнікаў будзе праводзіцца цалкам за рахунак ваеннага ведамства. На харчаваньне кожнага дапрызыўніка пры 180-гадзіннай праграме адпушчаецца 5 руб. і пры 240-гадз. праграме—6 руб. 50 кап.

Гэта складзе, у сярэднім, у дзень на кожнага дапрызыўніка каля 21 кап., г. зн. трохі менш, чым адпушчаецца штодзённа, у сярэднім, на харчаваньне кожнага кадравага чырвонаармейца. Меншая сума, якая адпушчаецца дапрызыўніку, тлумачыцца тым, што частку прадуктаў (у прыватнасьці—хлеб) дапрызыўнікі прыносяць з сабою свой, а гарачая страва гатовіцца для іх за рахунак ваеннага ведамства.

У дырэктывах штаба акругі падлічаны памылкі мінулага году і дадзен цэлы шэраг указаньняў аб лепшай арганізацыі заняткаў, здавальненьні дапрызыўнікаў неабходнымі дапамогамі, падрыхтоўцы кадравага камскладу і камскладу запаса, які прыцягваецца для навучаньня дапрызыўнікаў і г. д.

Усё гэта дае цьвёрдую ўпэўненасьць у тым, што дапрызпадрыхтоўка сёлетняга году праходзіць у яшчэ больш нармальных умовах і дасьць яшчэ лепшыя вынікі, чым у мінулыя гады.

Р. Л.

На пункты выяжджаем падрыхтаванымі.

(№ Чырвонаштандарны полк).

Кожную восень мы, тэрытарыяльнікі, кідаем свой Барысаў і выяжджаем у мястэчкі і вёскі для абучэньня дапрызыўнікаў, а таксама і для працы сярод пераменнага складу і насельніцтва. Сёлета мы загадзя пачалі да яе рыхтавацца. З гэтай мэтай былі праведзены сэмінары палітківраўнікоў і групаводаў. Перад самым-жа выездам праведзена нарада кампалітскладу, на якой абгаварваліся пытаньні: 1) міжнароднае і ўнутранае становішча; 2) задачы дапрызыўнай падрыхтоўкі і 3) міжзборавая работа. Самы разгляд гэтых пытаньняў сьведчыць аб тым, што на гэту працу зварачваецца належная ўвага і што думка кампалітскладу сканцэнтравана на тых пытаньнях, якія асабліва цікавяць усіх працоўных.

На нарадзе падкрэсьліваліся недахопы мінулага году і даваліся практычныя ўказаньні, як ад іх уникнуць у гэтым годзе. Акрамя сталай тэарэтычнай падрыхтоўкі кампалітскаду матар'яльная забясьпечанасьць пунктаў шмат лепшая, чым у мінулым годзе. Напершае, вылучаны сталыя бібліятэчкі на кожны вучпункт, выдадзена па 10 р. 50 к. на культасьветпрацу, абяцалі даць сродкі дзеля працы сярод пераменнага складу. І падругое, што за правядзеньне дапрызпадрыхтоўкі і на харчаваньне дапрызыўнікаў грошы выдалі перад выездам. Акрамя гэтага, сёлета ўсе дапрызыўнікі будуць харчавацца за кошт дзяржавы, а ў мінулым годзе харчавалася за кошт дзяржавы толькі 70 проц., што выклікала нездавальненьне сярод дапрызыўнікаў.

З упэўненасьцю можна сказаць, што сталая падрыхтоўка кампалітскладу—лепшая матар'яльная забясьпечанасьць камскладу і дапрызыўнікаў, дадуць лепшыя вынікі вучобы дапрызыўнікаў і працы сярод пераменнага складу і насельніцтва.

Вайскор.

Маленькі фэльетон.

Д-Р-Р-Р-РАМА...

Заўсёды мяне дзівілі крыўляньні магчыма добрых па прыродзе людзей, але «нарачыта» дрэнных акторaў...

Скажам «Минский Русский Театр»...

Сядзіце Вы сабе, глядач, ды дзівіцеся на сцэну,—раптам заслона адчыняецца, выходзіць актор і пачынае хапаць сябе за галаву, сэрца, жывот ды іншыя часткі цела,—мала гэтага, як задасьць ён яшчэ дрыжаку ў голасе,—млосна зробіцца!

Дык думаеце гэта ўсё?

Не! Найвялікшай экзальтацыі актор яшчэ не дасягнуў.

Але вось ён, як запаліцца патхненьнем, ды як разьвядзе рукамі, ды як «вдарыць» анфасам па сьцяне, ды як закрычыць...

... Божа мой, думаю я пацiху пра сябе, і чаго ён гэтак крычыць на іншых акторaў, бо саўсім магчыма, што гэта толькі надворнае, саўсім магчыма, што пад гатым жудасным акторскім грымам хаваюцца добрыя і ня сапсаваныя людзі, можа навучыць іх толькі трэба акторскаму рамяству, а ня крычаць на іх...

... І раптам чую ўжо нейкі новы актор крычыць на іншых,—ды б'ецца анфасам па сьценцы...

Божа мой! Халодны пот прабівае... Жудасна робіцца!

Др-р-р-р-р-рама!

. . . . . .

Заўсёды мяне дзівілі крыўляньні магчыма добрых ад прыроды людзей...

Тое самае і пра журналістаў...

Піша нейкі тав. Мар'ясін у «Заре Запада»...

Вось як піша:

Ленинится
Ленинится.
Да, да, *ленинится*, но не *линяцится.*

Гэта пачатак. А далей:

Ленинится во Франции «Ле орган-де Коти» аж до бунтов на военкораблях, не гладя на отзыв Раковского».

Альбо:

подумайце над Ленинским в нашей красной армии каждый боец коей мнит себя как таковой всего угнетенного мира.

Думаеце, чытачы, я маню?

Дальбог не!

Глядзіце «Зарю Запада» № 255 7-я старонка...

Дарагія, таварышы з «Зари Запада», пастаўце Вы сабе пытаньне прыдбаць ведаў у расейскай мове, бо як Вы з гэтага боку «спицилисты», дык нешк нязручна Вам даводзіць аб сваёй няпісьменнасьці...

. . . . . .

Мараль?

Кончу маральлю з Кузьмы Пруткова:

— «Сын мой, удивляйся, но не подражай».

Алёша.

Вёска сёньня.

Сялянская ўзаемадапамога.

Праца камітэтаў паляпшаецца.

Праца камітэтаў узаемадапамогі Уваравіцкага райёну ў гэтым годзе значна палепшылася, узрасла дапамога беднаце, як збожжам, так і грашыма, значна павялічыліся фонды камітэтаў, некаторыя КСУ так паставілі працу, што фонды за год павялічыліся ў некалькі разоў. Так, напрыклад, Габатовіцкі камітэт за год павялічыў свой фонд з 25 руб. да 250 руб. Па райёну лічацца пайшчыкамі 4601 бядняцкая гаспадарка, з паявым капіталам у 2501 руб.

КСУ таксама зацікаўлены машынізацыяй бядняцкіх гаспадарак, для гэтага яны набываюць розныя машыны, якія дастаўляюць беднякам на льготных умовах. Лік сельска-гаспадарчых машын у КСУ значна павялічыўся. Калі, напрыклад, у 1926 г. камітэты па райёну мелі ўсяго 6 сельска-гаспадарчых машын, то зараз маюць 48 розных сельска-гаспадарчых машын, павялічваецца таксама і лік машынных таварыстваў, арганізаваных камітэтамі. У 1926 годзе такіх таварыстваў па райёну было адно, цяпер мы маем 8.

У гэтым годзе камітэты маюць намер арганізаваць новыя арцелі саматужнікаў. Гэткіх арцеляў па райёну было арганізавана 27, у склад якіх уваходзіла 1234 бядняцкія гаспадаркі.

КСУ клапаціліся таксама і аб каапэраваньні бядняцкіх гаспадарак, за год было каапэравана за кошт камітэтаў 178 бядняцкіх гаспадарак, а за кошт арцеляў—430.

У часе асеньняга севу бядняцкім гаспадаркам было дадзена пазыкі: 1443 пуды 35 фун. збожжа і 1156 р. 53 кап. грашыма.

Усе гэтыя факты і лічбы сьведчаць аб тым, што дасягненьні ў працы камітэтаў маюцца. Але побач з гэтым трэба адзначыць, што дасягненьні гэтыя лічацца за кошт тых селькомаў, у якіх працуюць сапраўдныя беднякі зацікаўленыя працай, бо па райёне маюцца і гэткія камітэты, якія нічога ня робяць як, напрыклад: Рудня-Альхоўскі, Хоўхлянскі і іншыя. У часе перавыбараў трэба зьвярнуць на гэта ўвагу і гнаць гэткіх працаўнікоў з камітэтаў.

Дзяніс Духвалаў.

Уваравіцкі р., Гомельшчына.

На барацьбу з лесапарубкамі.

На сельска-гаспадарчую выстаўку Рагачоўскае лясьніцтва прадставіла дыяграмы, якія кажуць за тое, што ў нас лесапарубкі павялічваюцца з кожным годам.

Так, калі ў 1923 годзе было парубак 343, то ў 24 г.—631, а ў 27 г.—670 парубак.

Драўняной масы ў 26 годзе было высечана 417 куб. мэтраў, а ў 1927 г. 1051 куб. м. на суму: у 26 г. на 1848 руб., а ў 1927—7437 р.

А колькі такіх парубак, якія нікому невядомы. Гэтыя лічбы прымушаюць нашу грамадзкасьць зьвярнуць увагу на ахову лясоў, бо парубкі робіць большай часткай заможны селянін.

А пагэтаму пераход на лясную міліцыю адзіны шлях да зьберажэньня народнай гаспадаркі—лесу.

Савіцкі Я.

В. В. Крушынаўка, Рагачоўскага р., Бабруйшчына.

Гандляр „гуляе“

Пясоцкае спаж. т-ва «Дапамога» год таму назад арганізавала паходную краму, якая, разьязджаючы па вёсках, выціскала прыватніка.

Сяляне ахвотна куплялі тавары ў паходнай краме, бо дзе-ж там купляць у прыватніка, калі ў яго шмат даражэй.

Паходная крама пакрывала свае выдаткі і нават мела малы прыбытак. Але праўленьне каапэратыву гэтую краму скасавала і цяпер зноў па вёсках «гуляе» прыватны гандляр, бяручы ў тры дарагі з сялян за сваю даўнейшую страту.

Сяляне вёсак нездаволены гэтаю зьявай і гавораць.

— «Весь табе і каапэратыў, паказаўся к нам у вёску, як сонейка ў хмурны дзень, ды як-бы чаго спалохаўшыся зноў уцёк, даўшы волю прыватным гандляром зноў арудаваць у нас».

Вось у нас як!

Вандроўнік.

В. Восава, Капыльскі р., Меншчына.

На чатырох краінах.

(Уражаньні і сапраўднасьць).

Бэрлін--Карлсбад.

Едучы за рубеж, мы мелі на ўвазе хоць некалькі дзён адпачыць. Наша камандыроўка зьмяшчала ў сабе і водпуск. Вось чаму мы ўмовіліся паміж сабою абавязкова заехаць дзе-кольвечы ў ціхае, спакойлівае мейсца і прабыць у ім ад тыдню да двух. Гэтаму нашаму намеру якнайлепш спрыяла надзвычай цёплая нагодлівая восень. Але ўжо ачуўшыся ў Бэрліне думка аб адпачынку ўзялася над сумненьне. М. Зарэцкі выразна схіляўся на тое, каб абыйсьціся без адпачынку. Ня вельмі цягнула на гэта і М. Чарота. Яны абое пасьпелі крыху адпачыць перад паездкаю. Ды напатканыя вобразы зарубежжа занадта захапілі сабою, каб адарваць ад іх нашу ўвагу. Да гэтага яшчэ прыдалося непаразуменьне з візамі. Усе яны, ад нямецкае да францускае, супадалі па часе. Нам хацелася ніводнае з іх не прасрочыць. Атрымаўшы візу ў тую ці іншую краіну, вельмі шкада яе ня выкарыстаць. А ў нас выйшла гэтак, што пад пагрозу ставілася якраз віза француская. Ніводзін з нас траіх і думаць не хацеў, каб зьмінтрэжыць паездку ў Францыю. Прынамсі М. Чарота болей усяго вабіў Парыж і не пабыць у ім было бы раўнасільна невыпаўненьню і пазавіны праграмы нашае паездкі.

Перад тым, як ехаць у Карлсбад, (на вошта зрабілі Міхасі для мяне ўступку), мы справіліся ў нашым берлінскім прадстаўніцтве аб сроку францускае візы. Яксьці выйшла так, што нам далі неправільнае тлумачэньне, сказаўшы, што віза мае сілу на працягу месяца, а дня выдачы. Віза была пастаўлена 19 жніўня; а перад намі стаяў сёмы верасень—значна двухтыднёвы тэрмін, на які нам давалася права пабыць у Парыжы, мінаў. Не аставалася больш нічога рабіць, як ехаць у Чэха-Славаччыну і ўжо там уладжываць з працягам францускае візы. М. Чарот нават пэсымістычна махнуў рукою на падзеі пабываць у Парыжы. М. Зарэцкі, дык той гатоў быў ахвяраваць і Нямеччынай і Чэха-Славаччынай (вядома, і Карлсбадам), абы ня выпусьціць Парыжу. Але яго крыху астуджвала тое, што цёплая нагода перашкаджала пачатку сэзону ў Парыжы, што ўмаляла цікавасьць бываньня ў ім. Ужо у бязьверры на Францыю мы сабраліся ў Карлсбад, як мне надало яшчэ раз праверыць сілу францускае візы. На шчасьце, пасьля наводу розных справак, высьнілася, што француская віза мае сілу не на адзін месяц, а на тры. Знача ў нас аставалася досі часу на тое, каб ня толькі наведаць Парыж, а і пабываць у Чэха-Славаччыне і адпачыць у Карлсбадзе. Гэта перамяніла настрой ува ўсіх нас. І мы рашуча спыніліся на Карлсбадзе, як на першым пасьля Бэрліну этапу нашае паездкі.

Сёмага верасьня раніцою мы ўжо былі на Ангальтэр вакзале, прымайстраваўшыся ў спэцыяльным для курортных вагонаў. Міхасі, седзячы ў ім, гіранычна пасьмейваліся, будучы прычынамі да kurgäste. Тым ня меней, перамена дэкарацый, самы працэс язды па чужых пяведаных да гэтага мяйсцох прыдаваў цікавасьці і настрою. Праўда, перад самаю паездкаю, нечакана, зьмяніўся наш маршрут. Мы думалі ехаць у Карлсбад праз Дрэздэн і Саксонскую Швэйцарыю. Усю прыгожасьць апошняй я з М. Чаротам пасьпелі не аднойчы выхваліць перад М. Зарэцкім. Ды, прызнацца, нам усім хацелася яшчэ раз паглядзець на гэта харастро. Аднак, пры куплі білетаў аказалася, што ляпей і таньней ехаць не на Дрэздэн, а па Лейпцыг, праз Егер. Прышлося згадзіцца, хочаш-няхочаш. Для мяне з. М. Чаротам новы маршрут прыдаваў ня меней цікавасьці. А будучы знаёмы з дарогаю на Лейпцыг, я знаходзіў сваясаблівую кантоўнасьць у фабрычным характары мяйсцовасьці. «Калі так, дык чаго-ж хацець! Вельмі прыемна», задаволіўся М. Зарэцкі... І зусім незаўважна прабегла некалькі хвілін да адходу цягніка. Без званка, бяз сьвістка, па маху чырвоным кружком дэжурнага па станцыі мы крануліся з мейсца.

Кінаграфічнаю стужкаю паняслися ў ваччу будынкі, плятформы, масты. Цягнік вачавідкі ўзмацняў хаду, скачучы і стукаючы па бязьлічных стрэлках. Яшчэ далёка да выезду з гораду ён ужо разьвёў да таго шпаркую хаду, што нельга было ўстаць у праходзе. Адна за другою пашлі дачныя станцыі; за імі пачаўся прыгарад з зялёнымі купчастымі бульварамі; дачы-вілы аколеныя густымі садамі, ціхія, роўныя, як струны, асфальтавыя вуліцы. Далей, у адзін міг, горад адсекся. Высокія гладкія сьцены будынкаў нічым ня розных ад тых, што высяцца ў цэнтры Бэрліну, на Фрыдрыхстрасе, ці на Аляксандарпляц, адгарадзілі сабою вядомую палацу гародчыкаў. Яны, гэтыя гародчыкі, драбнюткія кавалачкі зямлі, надзеленай горадам рабочым, акаляюць весь горад. Малюпаткія будачкі-дачкі, у якіх нямецкія рабочыя часта пачуюць, а сьвятымі днямі п'юць каву і адбываюць дачны час, гэтыя будачкі выяўляюць сабою казачны, дзіцячы гарадок. На многіх з гэтых будачках настаўлены сьцягі, партыйныя, прафэсыянальныя, цэхавыя. Сярод іх шмат выглядае чырвоных, якія сьведчаць аб належнасьці гаспадароў іх да камуністычнае партыі... У гародчыках расьце гародніна (gemüse) і краскі. Людзей ня відаць—пагода дазваляе не сьпяшыць з выбарамі гародніны... За тое побач апошніх, дзе пачынаюцца палоскі ніў, роўных і гладкіх, прыбраных акуратна і дасьціпна, ідзе капаніна бульбы. Цэлымі сем'ямі мятусяцца земляробы пры гэтай працы. Відаць, як шарэнгамі стаяць поўныя бульбаю белыя-белыя мяшкі. То там, то сям ідзе ворыва на жыта. Аднак, у огуле, поле бязьлюдна. Жніва закончылася; дзе ўжо пасьпелі прыараць, а дзе гэта адложана надалей. Нават рэдка можна ўглядзець земляроба, едучага на бязьлічных, крыжуючых поле шасовых дарогах. Нават дзіўна робіцца, навошта гэтулькі адмысловых дарог, калі на іх мала хто езьдзіць! Куды ні паглядзі—бесканечнымі італяжамі сягаюць яны ад небасхілу да небасхілу. Ня відаць ніводнае вёскі, якая бы ня была зьвязана шашою з другою вёскаю ці з горадам.

Ня меней як шасэйных дарог, нападаецца нам настрочу чыгунак. Ад кожнае станцыі яны разьбягаюцца ва ўсе канцы, разрэзаючы роўную палогасьць мясцовасьці. Апошняя нічым не адрозьніваецца ад Усходняе Прусіі. Тая-ж неагляднай роўнадзь, утыканая та сям, та там купкамі маладзенькага хвойніку. Рэдкія вёскі, як адрэзаныя каналкі гораду, кімсьці раскіданы па шырокіх абшарах.

Але гэты ляндшафт хутка мяняецца на іншы. З уездам на тэрыторыю Саксоніі пачынаецца фабрычна-заводзкая мясьціна. Абапал чыгункі, блізу яе і наводдалёк, месьцяцца дзесяткі і сотні фабрык: парцэлянавых, пасудных, ткацкіх, сельска-гаспадарскіх машын. Лес комінаў няўхільна справодзіць цягнік у яго бегу к Лейпцыгу. Чым бліжай да гэтага гораду, тым больш ны подух прамысловага жыцьця. Не знайсьці месца, дзе б ня тырчэла некалькі комінаў, што выпускаюць цёмныя камякі дыму. Ім закурана ўсё неба, праз якое сумней сьвеціць сонца... А поўдні мы ачуваемся ў ахопе лейпцыгскіх будынкаў. Цягнік падвозіць нас над капеж вялізнага, аднаго з буйнейшых ў сьвеце вакзалаў. Дзесяткі плятформаў прымаюць і адпраўляюць цягнікі на Бэрлін, на Мюнхэн, на Хале, на Гамбург і інш. Усе яны поўны публікаю, але на плятформах пуста і прасторна. Мы выходзім з вагону і аглядаем вакзал. Цягнік стаіць каля дваццаці пяці хвілін—адна з даўжэйшых спынак. М. Чарот не забывае зьесьці каўбасак, а М. Зарэцкі выпіць сіп bier. Але выбегчы ў горад няма часу. Мы бачым, як наш склад цягніку сьпешна пераяжджае на другую плятформу. Публіка хаваецца ў вагоны. Лезем за іншымі і мы. І вось, глядзім, цягнік ізноў на ходзе. Цяпер ён павяртае ўправа, агібаючы горад і накідаючы назадзе дзесяткі пуцей, вёслы вагонаў, слупы электрычнае дарогі Лейпцыг—Хале. А неўзабаве мы сярод палёў, быццам бы да дробкі схожых з тымі, што аддзяляюць сабою Бэрлін ад Лейпцыгу. Хацелася-бы зьмены дэкарацыі. Хацелася-бы спыніць погляд на ляску ці на горцы. Робіцца шкада, што не ўдалося паехаць на Дрэздэн...

Аднак, гэты настрой паступова гіне. Хутка нам насустрэч пачынаюць выглядаць іншыя вобразы. Цягнік апыняецца ў мясцовасьці атрогаў Саксонскіх гор: вось яны ўжо перасякаюць нам дарогу, збачаюць та ўправа, та ўлева наш цягнік; паднімаюць яго над неланымі, закуранымі дымам фабрык, гарадкамі; уганяюць у вузкія равы, агаптаваныя прыгожым маладым сасоньнкам. Крывая выгінастая паласа чыгункі верціцца на зялёным дыване мураўкі і ні на хвіліну не адбягае ад стромкае бурлівае рачулкі...

Мы прыліпаем да вокан вагону і ня можам адарвацца ад прыгожасьці раскінутых перад намі відокаў. Якое харастро! Як дзіўна злуч

ШТО СКАЗАЛА ПОЛЬСКАЯ РАБОЧАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ ПРА БЕЛАРУСКІ ТЭАТР.

Польская рабочая дэлегацыя наведала Другі Беларускі Дзяржаўны Тэатр у Менску, дзе прысутнічала на генэральнай рэпэтыцыі прэм'еры „Каля тэрасы".

Друкуем ніжэй ліст, прыслалы польскай дэлегацыяй які характарызуе іх погляд на беларускі тэатр.

„Тэатр беларускі ў Менску, які радзіўся дзякуючы перамозе Кастрычнікавай рэвалюцыі, які пачаў адбіваць новыя плыні ў творчасьці, зьвязаныя з тагочасным агульным рэвалюцыйным пераломам, пакінуў у нашых думках уражаньне, якое застанецца ў нас назаўсёды.

Рэалізм твору „Каля тэрасы" шырокая артыстычнасьць шэрагу сцэн, дасканала рэжысура,—усё сьведчыць аб тым размаху, з якім малады беларускі тэатр на службе пралетарскай культуры так разьвінуўся, яму мы прадказваем славутую будучыню.

Артыстычнай супольцы шчырае пралетарскае павіншаваньне".

Ч. Ясінскі, Ч. Лучак, Кароль, Марта Шурская.

Да зімовай кампаніі МОПР'у.

(Гутарка з намесьнікам старшыні прэзыдыуму ЦК МОПР'у т. Калмыком).

Становішча палітвязьняў у буржуазных краінах у зімовы час асабліва цяжкае: недахоп адзеньня і вільготныя памяшканьні дрэнна адбіваюцца на іх здароўі. Як вядома, белы тэрор у буржуазных краінах вельмі моцны. У гэтых адносінах не адстае наша суседка Польшча, дзе становішча палітвязьняў асабліва цяжкае, дзе нават яшчэ існуе, як сыстэма, катаваньне палітвязьняў.

Дрэннае харчаваньне ў астрогах: фунт хлеба ў дзень, мяса зусім не даюць, холад, вільгаць, на глебе недаяданьня—хваробы.

Гэткае становішча, у якім зараз знаходзіцца да 5 тысяч палітвязьняў у польскіх астрогах, вымагае ад МОПР'у і яго арганізацый на мясцох узмоцненай матар'яльнай дапамогі ў бліжэйшыя 3 зімовыя месяцы. Дзеля гэтага ЦК МОПР'у БССР выпрацаваў шэрах практычных мерапрыёмстваў на ўзмацненьні зімовай дапамогі палітвязьням польскіх астрогаў. На гэта пытаньне павінны зьвярнуць сур'ёзную ўвагу ніжэйшыя арганізацыі МОПР'у, акругкомы, райкомы і ячэйкі, прыцягнуўшы да гэтай справы шырокія масы рабочых, сялян, жанчын, моладзь, саматужнікаў і вучьняў з тым, каб бліжэйшыя 3 зімовыя месяцы былі месяцамі ўзмоцненай працы па дапамозе палітвязьням Польшчы і Заходняй Беларусі. Нашы мопр'аўскія арганізацыі ўжо ня раз паказвалі, што ў патрэбны момант яны ўмеюць мабілізаваць масы і грамадзкую думку працоўных вакол пытаньня дапамогі палітвязьням і іх сем'ям. Даволі прыпомніць леташнюю кампанію дапамогі палітвязьням Заходняй Беларусі, каб быць упэўненым, што нашы мопраўскія арганізацыі і зараз шырока разгорнуць кампанію дапамогі нашым братом у цяжкі для іх момант.

СУД.

ПА ДЗЕСЯЦЬ КАПЕЕК З ГАЛАВЫ.

Чатыры дні ў Менскім акруговым судзе разбіралася справа шчодрых „шэфаў" з менскай бойні.

У нашай газэце ўжо пісалася аб тым, што яны бралі „ня шмат" з прыватных мяса-гандляроў—толькі па 10 капеек з кожнай забітай жывёліны. Спачатку па 10 капеек бралася на карысьць розных грамадзкіх арганізацый, а пасьля, калі гэтыя зборы былі скасаваны, „грэўні" паступалі на „патрэбы ячэйкі і шэфства".

«Патрэбы» гэтыя ўсё павялічваліся. Сродкаў было, як кажуць, у эбрэз. Ініцыятыва „дырэктара" і тут вывела: ён даў загад аб тым, каб паставіць на бойні вагу.

— На што?—пыталіся ў „дырэктара".

— Не твая справа. Стаў, калі табе кажуць.

Вагу паставілі. Калі хто-небудзь забіе на бойні жывёліну, яму прапануюць:

— Ці ня хочаце важыць тушу? Усяго 20 капеек за вагу, гэта—ня грошы, а ведаць цікава.

— Ну, як вам сказаць?.. Важыць?.. Можна зважыць.

І важылі. А сродкі „на патрэбы" розныя расьлі.

Спосаб грашовай справаздачы быў ня хітры, але даволі галаваломны, бо ні суд, ні экспэртыза ў ім дакладна разабрацца не маглі. Уся справаздача складалася з кніг, у якія грошы запісваліся, але спосаб гэтай „бухгальтэрыі" дасюль яшчэ не разгадан: ні то яна італьянская, ні то амэрыканская, ні то камбінаваная. Як ні стараўся суд высьветліць, колькі грошай „сабрана" і колькі прысвоена—нічога ня мог дабіцца: прыблізна каля 2.000 руб.

Яны стараліся, каб „пабочныя" партыйцы, (якія ня ўходзілі ў склад бюро ячэйкі), аб гэтых сродках нічога ня ведалі. Збор і выдача гэтых сродкаў насілі строга-канспірацыйны характар.

Пасьля 6-цігадзінай нарады быў абвешчан наступны прыгавар:

Радзіянка і Шпайдэрмана суд прыгаварыў на 1 год зьняволеньня бяз суровага адмежаваньня кожнага. Дастасаваўшы да асуджаных амністыю ўраду СССР, суд паставіў пад варту іх ня браць. Рэшта падсудных апраўданы.

С. Азерскі.

З сёньняшнім нумарам газэты падпісчыкам рассылаецца часопісь „Маладняк" № 9 за верасень месяц.

Хроніка.

Камісія па ўвядзеньню 7-мігадзіннага рабочага дню ў прамысловасьці БССР.

Учора на пасяджэньні прэзыдыуму ВСНГБ вылучана камісія па ўвядзеньню 7-мігадзіннага рабочага дню ў Беларускай прамысловасьці У склад камісіі ўвайшлі: т.т. Міленькі, Стракоўскі, Шульман, Якубсон і Пэйгін.

Прынята пастанова аб падрыхтоўцы да правядзеньня дэкрэту савецкага ўраду аб пераходзе на 7-мігадзінны рабочы дзень у некаторых галінах прамысловасьці БССР. ВСНГБ даў распараджэньні трэстам, каб апошнія прадставілі свае думкі наконт гэтага пытаньня.

Разам з гэтым прэзыдыум ВСНГБ узбудзіў хадайніцтва перад урадам БССР аб утварэньні ўрадавай намісіі па праапрацоўцы гэтага пытаньня.

Зьезды прадстаўнікоў нацменшасьцяй.

20-га студзеня склікаецца ўсебеларускі зьезд яўрэяў-сялян у ліку 200 дэлегатаў. На зьезд запрашаюцца прадстаўнікі яўрэяў-земляробаў з РСФСР, УССР і 1-га яўрэйскага Калідорфскага райёну. Атрымаюць таксама запрашэньні на зьезд тыя замежныя яўрэйскія арганізацыі, якія адносяцца спрыяюча да яўрэйскага земляўпарадкаваньня ў Савецкім Саюзе.

— 25-га студзеня склікаецца ўсебеларускі зьезд рабочых і сялян-латышоў. У зьезьдзе прыме ўдзел 80 дэлегатаў.

— На 29 студзеня прызначан усебеларускі зьезд рабочых і сялян-палякаў у складзе 150 чалавек. На зьезд запрашаюцца прадстаўнікі рабочых і сялян-палякаў з Савецкай Украіны.

Палепшаньне санітарнага становішча гораду.

Гэтымі днямі адбылося пасяджэньне сэкцыі аховы здароўя пры Менскім гарсавеце. Было разгледжана пытаньне аб санітарным становішчы гораду.

Заслухаўшы шэраг заўваг абсьледаваделяў, сэкцыя пастанавіла прыняць шэраг мерапрыёмстваў па паляпшэньні санітарнага становішча гораду.

Прыняць меры да пераводу клееварных і мылаварных заводаў на акраіны гораду; перабудаваць Каломенскі і Ніжні рынкі так, каб зьнішчыць іх антысанітарнае становішча і замясьціць акраінныя вуліцы; пашырыць варазную больніцу да 200 ложак і адчыніць ізаляцыйны дом для востра-заразных хворых; палепшыць ужываньне вады праз пераход на ваду з артэзіянскіх студняў і распачаць падрыхтоўку на пабудове фабрычы-кухні; абсьледаваць санітарнае становішча дамоў ЖАКТ'аў з удзелам шырокіх мас насяленьня.

Нарада працаўнікоў с.-гасп. крэдыту.

Сёньня а 9-ай гадзіне зранку адчыняецца пры Белсельбанку нарада працаўнікоў сельска-гаспадарчага крэдыту. На нарадзе прысутнічае член праўленьня Цэнтральнага сельска-гаспадарчага банку т. Міхаіл, прадстаўнікі Наркамфіну і Наркамзему БССР, Белсельсаюзу, ЦК Узаемадапамогі і кіраўнікі акрсельбанкаў.

Першы даклад зробіць тав, Матусевіч аб выніках працы нізавой сеткі. Нарада працягнецца 2 дні.

Рост асыгнаваньняў на новае будаўніцтва прамысловасьці.

На будаўніцтва новых прадпрыёмстваў у 1926-27 годзе было застрахована 3762 тысяч рублёў, а ў лотаншім годзе ўсяго толькі 530 тысяч рублёў. Такім чынам, асыгнаваньні павялічыліся больш як на 600 процантаў.

У 1927 г. пераведзена на шматпольле 85895 дзес.

У 1927 годзе на БССР пераведзена на шматпольле 85895 дзесяцін, што ў параўнаньні з мінулым годам дае павялічэньне на 23,9 проц.

Курсы «ЦИТ» дадуць 760 кваліфікаваных рабочых.

У 1927-28 годзе праз курсы «ЦИТ» мае быць прапушчана 760 чалавек. (Будзе выпушчана 360 кваліфікаваных будаўнікоў, 300 сьлесараў і 100 дрэваапрацоўчыкаў.

Гатунковыя куры з заграніцы.

Наркамзем атрымаў з Даніі 104 гнязды гатунковых курэй: белы віандот і плімутрок. Куры прадаюцца ў крэдыт на 25 руб. за гняздо.

Рост сяброў саюзаў.

На 1-га студзеня 1926 году ў Беларусі налічвалася членаў прафсаюзаў 149.169 чалавек, а на першае ліпеня 1927 г. разам з Гомельшчынай іх налічваецца ўжо 323.328 чалавек.

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА.

На 625 тысяч рублёў скураных тавараў.

Згодна пляну Скурсындыкату, у працягу сьнежня ў Менскую кантору сындыкату будзе завезена розных скураных тавараў на 625 тысяч руб., у гэтым ліку: падашвы—92 тоны, палувалу—40 тон, хрому—90 тыс. футаў і інш.

Апроч таго, Наркамгандлю СССР намеціў выдзеліць для БССР з разэрву на першы квартал 27-28 г. розных скураных тавараў на 100 тыс. рублёў.

Галянтарэйныя і трыкатажныя тавары для БССР.

Маскоўская кантора Белкаапсаюзу па генэральным дагаворы Цэнтрасаюзу атрымлівае ў 27-28 г. розных галянтарэйных і трыкатажных тавараў сындыкаванай прамысловасьці на 600 тыс. руб.

Апроч таго, па дагаворы з Маскоўскім прамсаюзам гэтых тавараў будзе атрымана на 62 тыс. руб. і з Сельпрамсаюзам—на 60 тыс. рубл.

Тэкстыльныя тавары для льнаводных райёнаў.

Па хадайніцтву Сталага Прадстаўніцтва БССР Наркамгандлю СССР выдзеліў, звыш пляну, для завозу ў Беларусь дадаткова 5 вагонаў тэкстыльных тавараў для льнаводных райёнаў.

Будзе завезена 3.100.000 пуд. вотрубей.

Патрэба Беларусі ў вотрубах складае 5.500.000 пуд. Наркамгандлю БССР зьвярнуўся ў Наркамгандлю СССР з просьбай з наказанай колькасьці зацьвердзіць да завозу на 27-28 г. у плянавым парадку 3.100.000 пуд. Рэшта—2.400.000 пуд мае быць пакрыта часткай вотрубамі, якія атрымліваюцца на мясцовых млынох, а таксама шляхам—закупкі вотрубей па камэрцыйных зьдзелках.

Апавяшчэньне.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

У пятніцу, 2-12 адбудзецца вечар змычкі саюзу ПРАЦАСЬВЕТЫ з падшэфнаю вайсковаю часьцю.

Уваход па распаўсюджаных білетах па МК Пачатак роўна а 9-й г. в.

ТЭАТР-КІНО.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР
Нядзеля, 4 сьнежня
Паказ у карысьць 4-й сав. школы.
ПАКАЗ 21 (118) „Сон у летнюю ноч" 7(29 РАЗ)
Камедыя ў 3-х дз. У. Шэкспіра.
Пачатак а 8 з палов. гадз. вечара.
Білеты, што засталіся, прадаюцца ў касе тэатру.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА» — З аўторка, 29 лістапада, „МАСКА СОРВАНА" (Цені Бэльвэдэра)

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". — Мастацкая фільма „РЕЙС МИСТЕРА ЛЛОЙДА" у 6 часьцях. АНОНС! Чарговы баявік „Парижанка".

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». — З аўторка, 29 лістапада, „ЧЕРНЫЙ КОНВЕРТ". З удзелам Гарры Пільля.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ". — Выд. фільма, якая ішла па СССР з вялікім посьпехам „СОЛИСТКА ЕГО ВЕЛИЧЕСТВА" у 7 часьцях.

АГРОНОМИЧЕСКОЕ БЮРО
Московского Общества Сельского Хозяйства предлагает к сезону 1928 года СЕМЕНА: трав, огородные, цветочные и полевые испытанной всхожести и чистосортности.
Полный каталог бесплатно по требованию.
Адрес: Москва, Смоленский Бульвар, д. 8.

Дзяржаўныя ўстановы і прадпрыёмствы, а таксама каапэрацыйныя арганізацыі, у якіх, у сувязі з рэформай гэрбавага статуту, засталіся нескарыстаныя гэрбавыя маркі,

МОГУЦЬ ДА 15 СЬНЕЖНЯ 1927 г. ПАДАВАЦЬ АКРФІНАДДЗЕЛАМ ЗАЯВЫ З ПАКАЗАНЬНЕМ ДАКЛАДНАЙ КОЛЬКАСЬЦІ І КУПЮР МАРАК.

Маркі гэтыя будуць прымацца фінорганамі і залічвацца ў 1-м паўгодзьдзі 1927-28 г. у выплату авансаў падатку са звароту каштоўнасьцяў.

За Наркамфіна КАРДАШЭНКА.
Пам Нач. Падатковага Кіраўніцтва РЭКСЬЦІН.
29 лістапада 27 г.

Галоўлітбел № 2468.

ПРАДАЕЦЦА
зрыў-папера макулатура і старыя газэты.
Спытацца ў канторы газэты „Савецкая Беларусь" (Рог вуліц Карла Маркса і Ленінскай, 2-гі дом Саветаў).

ЗГУБЛЕНЫ:

— Вайсковы дакумант Сасонкіна М. С., выд. Чэрвенскім РВК, кв 124.

— Каапэрац. кніжка Шрайбман О., выд. МЦРК, кв. 125.

— Квіт. за № 3919 Саладоўніка Ш. Я. аб узносе залога ў суме 10 руб., выд. Барысаўск. камгаспадаркай.

— Сяброўская кніжка Фрыдлянд В. С., выд. саюзам працасьветы, кв. 115.

— Квіт. за № 2748 на суму 8 р. 25 к. і № 4380 на суму 8 руб. 6 кап. выд. Рудзенскім Желязкомам на імя Казімірчыка І. Л., кв. 116.

— Асабова-вайсковая кніжка дапрызыўн. за № 265, выд. Бягомльскім РВК ад 4-VII—26 г., 2) вучотна-коіская кніжка № 311, выд. Бярэзінскім ВВК у 1923 г. на імя Ласкага П. П., кв. 117.

— Пасьведчаньне аб нараджэньні Александровіча Р., выд. Менскім Загсам, кв. 122.

Законы і загады ўраду БССР.

Цыркулярна.

Усім акруговым выканаўчым камітэтам

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастановай сваёй ад 26 лістапада 1927 г. зацьвердзіў тэрміны падрыхтоўкі і правядзеньня перавыбарчай і справаздачнай кампаніі сельскіх, местачковых і гарадзкіх саветаў, райённых і акруговых выканаўчых камітэтаў у 1928 годзе («Савецкая Беларусь», № 269 за 27-XI).

Улічваючы вялізарнае палітычнае значэньне надыходзячай перавыбарчай кампаніі, акруговым выканаўчым камітэтам неабходна забясьпечыць яе пасьпяховае правядзеньне з поўным падлікам дасягненьняў і недахопаў мінулае кампаніі і ўсьвядомленьнем задач, якія стаяць у сучасную пару перад Савецкаю ўладаю.

Асноўнымі дасягненьнямі ў перавыбарах 1926-27 г. зьяўляюцца: а) значны рост палітычнай актыўнасьці працоўных гораду і вёскі, у прыватнасьці жанчын, на грунце агульнага ўздыму іх жыцьцёвага ўзроўню і правільнага правядзеньня палітыкі ўзьдзеяньня саветаў; б) пры гэтым найбольшая актыўнасьць была праяўлена з боку рабочае клясы, што яшчэ больш замацавала яе кіруючую ролю ў адносінах усіх працоўных мас рэспублікі; в) значна шырэйшае, чымся ў мінулыя гады, арганізацыйнае ахапленьне беднаты пры адначасовым узмацненьні саюзу беднаты і рабочае клясы з серадняком; г) павялічэньне пралетарскага і бяднацкага асяродку ў выбарных савецкіх органах і яго актыўнай ролі ў апошніх пры адначасовым захаваньні прынцыпаў савецкае дэмакратыі; д) шырокае абслугоўваньне і выяўленьне запытаў нацыянальных меншасьцяй.

Гэтаму ў значнай меры дапамаглі своячасна і шырока разгорнутая прадвыбарча-справаздачная кампанія і сыстэма мерапрыёмстваў арганізацыйнага парадку, як разбуйненьне выбарчых вучасткаў і г. д.

Адначасова ў мінулай кампаніі меўся і шэраг недахопаў, як: а) далейшае зьніжэньне ліку жанчын у складзе сельскіх і местачковых саветаў і недастатковае вылучэньне жанчын-работніц у саветы гарадоў, якія зьяўляюцца прамысловымі цэнтрамі з значнай колькасьцю пралетарыяту; б) пры паяўнасьці больш шырока разгорнутай, у параўнаньні з мінулымі гадамі, працы сярод вясковай беднаты, такою ахоплена было каля 50 проц. выбарчых вучасткаў, а ў гарадох гэтая праца амаль не праводзілася зусім; г) недастаткова ўцягнута было ў кампанію батрацтва і сельска-гаспадарчыя рабочыя і некалькі зьменшыўся іх лік у складзе кіруючай часьці сельсаветаў; г) зьменшыўся, хаця і нязначна (на 0,26) агульны процант яўкі на выбары ў сельскіх мясцовасьцях; д) ня зусім здавальняючая якасьць справаздачнасьці ў частцы сельскіх і местачковых саветаў, недастатковая справаздачнасьць іх рэвізійных камісій і слабае прыцягваньне да справаздачнасьці аб сваёй рабоце паасобных членаў сельскіх, местачковых і гарадзкіх саветаў; е) недастатковы ўдзел у кампаніі прафсыйных і грамадзкіх арганізацый вёскі; ж) слабае скарыстаньне, як сродкаў, прадвыбарчай агітацыі насьценных газэт, хат-чытальняў, клюбаў і народных дамоў.

Перавыбары саветаў 1928 году павінны быць накіраваны ў напрамку: а) далейшага ўздыму актыўнасьці ўсіх працоўных; б) замацаваньне ў саветах кіруючай ролі пралетарыяту; в) яшчэ большага замацаваньня бяднацка-серадняцкага блёку; г) большага ўцягненьня батрацтва як у самую кампанію, гэтак і ў склад выбарчых органаў на вёсцы; д) яшчэ большага павялічэньня актыўнасьці працоўных жанчын і бязумоўнага павялічэньня іх удзельнай вагі ў складзе выбарных савецкіх органаў, асабліва сельскіх і местачковых саветаў; е) поўнага ізаляваньня кулацтва і паогул варожых да савецкае ўлады груповак гораду і вёскі; ж) далейшага ажыўленьня масавай і практычнай працы саветаў; з) асяродкаваньня ўвагі працоўных на задачах абароны краіны, яе індустрыялізацыі і ратуючае барацьбы за палепшаньне нашага дзяржаўнага апарату.

Вопыт мінулае перавыбарчае кампаніі паказаў, што існуючая «Інструкцыя аб выбарах у саветы» цалкам адпавядае задачам недапушчэньня эксплёататарскіх і кулацкіх элемэнтаў у саветы. З гэтае прычыны Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту знайшоў неабходным захаваць у асноўным інструкцыю аб выбарах у саветы, выданую ў 1926 г., дапоўніўшы яе тлумачэньнямі і ўдакладненьнямі, якія былі прыняты пасьля Цэнтральным Выканаўчым Камітэтам Саюзу ССР і БССР.

Выходзячы з пералічаных агульных задач, якія стаяць у чарговую перавыбарчую кампанію, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР прапануе зараз-жа прыступіць да падрыхтоўчай працы па перавыбарах, а іменна:

1. Арганізаваць акруговыя і мясцовыя выбарчыя камісіі.

2. Распрацаваць каляндарныя пляны кампаніі, прыслаўшы такія ў тыдневы тэрмін у Цэнтральную Выбарчую Камісію.

3. Прыступіць к праверцы сьпісаў выбаршчыкаў і пазбаўленых выбарчага права, не дапускаючы пры гэтым ніякіх адступленьняў ад інструкцыі аб выбарах у саветы БССР і дапоўніць гэтыя сьпіскі наступнымі графамі:

а) у сьпісках выбаршчыкаў па гарадох—«нацыянальнасьць» і «калі член прафсаюзу, то якога»;

б) у сьпісках выбаршчыкаў сельскіх і местачковых мясцовасьцяй—«нацыянальнасьць» і для сялян—«сума уплочваемага падатку на душу таго двара, членам якога зьяўляецца выбаршчык»;

в) у сьпісах пазбаўленых выбарчага права—дадаць графы: «пол», «год нараджэньня», «нацыянальнасьць», і для пазбаўленых выбарчага права як утрымацы асоб, што гэтым правам не карыстаюцца, дакладна адзначаць прычыны пазбаўленьня выбарчага права тых асоб, на ўтрыманьні якіх яны знаходзяцца.

4. Забясьпечыць у поўнай меры арганізацыйна-тэхнічную падрыхтоўку кампаніі (своячасне і ў дастатковай колькасьці вызначэньне выбарчых вучасткаў, абвяшчэньне выбаршчыкаў, інструктаваньне працаўнікоў, распрацоўка справаздач, распрацоўка яскравых і сьціслых наказаў і г. д.).

5. Зьвязацца з грамадзкімі, камсамольскімі, прафсыйнымі арганізацыямі гораду і вёскі па прадмет максымальнага ўдзелу гэтых арганізацый у кампаніі і ўвязкі іх плянаў з плянамі выбарчых камісій; у прыватнасьці зьвярнуць увагу на ўдзел у кампаніі на вёсцы саюзу працаўнікоў зямлі і лесу і камітэтаў сялянскай узаемадапамогі.

6. Пры правядзеньні справаздачнае кампаніі неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на засьвятленьне справаздачамі ў ступені выканаьня саветамі наказаў выбаршчыкаў, разгарнуўшы, побач з агульнымі справаздачамі, шырокую справаздачнасьць пасаобных дэпутатаў аб сваёй працы, а таксама пашырыць справаздачнасьць выканаўчых камітэтаў перад саветамі і выбаршчыкамі. У мэтах забясьпечаньня якасьці гэтых справаздач неабходна падабраць і падрыхтаваць належны кадр вопытных працаўнікоў.

7. Неабходна забясьпечыць найбольш поўнае абслугоўваньне нацыянальных меншасьцяў і ўцягненьне іх да актыўнага ўдзелу ў кампаніі, шляхам дасканала распрацаваных мерапрыёмстваў.

8. Адной з важнейшых задач сучаснага моманту зьяўляецца таксама замацаваньне ў падыходзячую перавыбарчую кампанію тае вялікае зацікаўленасьці працоўных жанчын савецкім будаўніцтвам, якая была выказана на нядаўна праведзеных мясцовых і ўсесаюзным зьездах. Працоўныя жанчыны павінны быць максымальна ўцягнуты, як у прадвыбарчыя мерапрыёмствы, гэтак і ў выбарчую кампанію, а іх актыў—у бязумоўна больш шырокай меры чымся раней, павінен быць уцягнуты ў арганізацыйную працу па правядзеньню кампаніі і ў выбарны кіруючы склад саветаў і выканкомаў.

9. Істотнейшай задачай у перавыбарчай кампаніі гэтага году зьяўляецца таксама найбольш поўнае ўцягненьне батрацтва і беднаты, якія ўсё яшчэ недастаткова ўдзельнічалі ў леташніх перавыбарах. Неабходна распрацаваць і правесьці шэраг канкрэтных мерапрыёмстваў, якія-б забясьпечылі-б максымальны ўздым актыўнасьці батрацтва і беднякоў у перавыбарчай кампаніі гэтага году, а таксама далейшае павялічэньне іх удзельнае вагі ў выбарчым складзе саветаў і выканкомаў.

10. Неабходна шырока выкарыстаць на працягу прадвыбарчай кампаніі сялянскі бяднацкі актыў, уцягнуўшы яго як у падрыхтоўчую працу, гэтак і ў правядзеньне самое справаздачнае кампаніі і перавыбараў.

11. Нарэшце, у часе прадвыбарчае кампаніі неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на старанную падрыхтоўку і падбор кандыдатур у саветы, ставячы іх на ўсебаковае абгаварэньне прадвыбарчых сходаў батрацтва, беднаты, жанчын, прафсаюзаў, беспартыйнага рабочага і сялянскага актыву і г. д.

12. Поўнае ажыцьцяўленьне гэтых мерапрыёмстваў дасьць магчымасьць правядзеньня на выбарах шырокае пралетарскае дэмакратыі, якая ні ў якім разе не павінна падменьвацца мэтадамі мэханічнага ўціску на выбаршчыкаў.

Падкрэсьліваючы гэтыя задачы чарговых перавыбараў, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту зварачвае вашу ўвагу на важнасьць поўнага колькаснага і якаснага вучоту кампаніі і праводзімых у сувязі з ёй мерапрыёмстваў і іх вынікаў.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч

1-га сьнежня 1927 г.
гор. Менск.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб утварэньні выбарчых камісій і зацьверджаньні старшынь акруг. выбарчых камісій.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту пастанаўляе:

1. Прапанаваць акруговым выканаўчым камітэтам зараз-жа прыступіць к арганізацыі акруговых, райённых, гарадзкіх, местачковых і сельскіх выбарчых камісій, кіруючыся пры іх утварэньні інструкцыяй аб выбарах у саветы БССР, зацьверджанай Прэзыдыумам Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР 26-га лістапада 1927 году.

2. Старшынямі акруговых выбарчых камісій зацьвердзіць:

а) па Бабруйскай акр.—тав. Рачыцкага,
б) па Віцебскай акр. —тав. Паўлюкевіча,
в) па Гомельскай акр.—тав. Малаковіча,
г) па Менскай акр.—тав. Яцкевіча,
д) па Магілеўскай акр.—тав. Дзьякова,
е) па Мазырскай акр.—тав. Стрэлю,
ж) па Аршанскай акр.—тав. Амбражуласа,
з) па Полацкай акр.—тав. Кандраля.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

1 сьнежня 1927 г.
г. Менск.

Циркулярно.

Всем окрисполкомам.

Президиумам Центрального Исполнительного Комитета БССР своим постановлением от 26 ноября 1927 года утвердил сроки подготовки и проведения перевыборной и отчетной кампании сельских, местечковых и городских советов, районных и окружных исполнительных комитетов в 1928 году («Савецкая Беларусь», № 269 за 27-XI).

Учитывая громадное политическое значение наступающей перевыборной кампании, окружным исполнительным комитетам необходимо обеспечить ее успешное проведение с полным учетом достижений и недочетов прошедшей кампании и уяснением задач, стоящих в настоящее время перед Советской властью.

Основными достижениями в перевыборах 1926-27 г. являются: а) значительный рост политической активности трудящихся города и деревни, в частности, женщин, на основе общего поднятия их жизненного уровня и правильного проведения политики оживления Советов; б) при этом наибольшая активность была проявлена со стороны рабочего класса, что еще больш укрепило его руководящую роль в отношении всех трудящихся масс республики; в) значительно более широкий, нежели в прошлые годы, организационный охват бедноты при одновременном укреплении союза бедноты рабочего класса с середняком; г) увеличение пролетарского и бедняцкого ядра в выборных советских органах и его активной роли в последних при одновременном сохранении принципов советской демократии; д) широкое обслуживание и выявление запросов национальных меньшинств.

Этому в значительной мере содействовали своевременно и широко развернутое предвыборно-отчетная кампания и система мероприятий организационного порядка, как разукрупнение избирательных участков и т. д.

Одновременно в прошедшей кампании имелся и ряд недочетов, так: а) дальнейшее снижение числа женщин в составе сельских и местечковых советов и недостаточное выдвижение женщин работниц в советы городов, являющихся промышленными центрами со значительным количеством пролетариата; б) при наличии более широко развернутой, по сравнению с прошедшими годами, работы среди сельской бедноты, такою охвачено было около 50 проц. избирательных участков, а в городах эта работа почти не проводилась совершенно; в) недостаточно вовлечено было в кампанию батрачество и сельско-хозяйственные рабочие и несколько уменьшилось число их в составе руководящей части сельсоветов; г) уменьшился, хотя и незначительно (на 0,26), общий процент явки на выборы в сельских местностях; д) не совсем удовлетворительная качественно отчетность в части сельских и местечковых советов, недостаточная отчетность их ревизионных комиссий и слабое привлечение к отчетности о своей работе отдельных членов сельских, местечковых и городских советов; е) недостаточное участие в кампании профессиональных и общественных организаций деревни; ж) слабое использование, как средств предвыборной агитации, стенных газет, изб-читален, клубов и народных домов.

Перевыборы советов в 1928 году должны быть направлены в сторону: а) дальнейшего поднятия активности всех трудящихся; б) закрепления в советах руководящей роли пролетариата; в) еще большего закрепления бедняцко-середняцкого блока; г) большего вовлечения батрачества как в самую кампанию, так и в состав выборных органов деревни; д) еще большего увеличения активности трудящихся женщин и безусловного увеличения их удельного веса в составе выборных советских органов, особенно сельских и местечковых советов; е) полного изолирования кулачества и вообще враждебных советской власти группировок города и деревни; ж) дальнейшего оживления массовой и практической работы советов; з) сосредоточения внимания трудящихся на задачах обороны страны, ее индустриализации и решительной борьбы за улучшение нашего государственного аппарата.

Опыт прошедшей перевыборной кампании показал, что существующая «Инструкция о выборах в советы» целиком соответствует задачам недопущения эксплоататорских и кулацких элементов в советы. По этой причине Президиум Центрального Исполнительного Комитета нашел необходимым сохранить в основном инструкцию о выборах в советы, изданную в 1926 г., дополнив ее пояснениями и уточнениями, которые были приняты впоследствии Центральным Исполнительным Комитетам Союза ССР и БССР.

Исходя из перечисленных общих задач, стоящих в очередную перевыборную кампанию, Президиум Центрального Исполнительного Комитета БССР предлагает немедленно приступить к подготовительной работе по перевыборам, а именно:

1. организовать окружные и местные избирательные комиссии;

2. разработать календарные планы кампании, прислав таковые в недельный срок Центральной Избирательной Комиссии.

3. Приступить к проверке списков избирателей и лишенных избирательного права, не допуская при этом никаких отступлений от существующей инструкции о выборах в советы БССР дополнить эти списки следующими графами:

а) в списках избирателей по городам—«национальность» и «если член профсоюза, то какого»;

б) в списках избирателей сельских и местечковых местностей—«национальность» и для крестьян—«сумма уплачиваемого налога на душу того двора, членом которого является избиратель»;

в) в списках, лишенных избирательного права вставить графы: «пол», „год рождения", «национальность» для лишенных избирательного права как иждивенцы лиц, этим правом пользующихся, точно отмечать причины лишения избирательного права тех лиц, на содержании которых они находятся.

4. Обеспечить в полной мере организационно - техническую подготовку кампании (своевременное и в достаточном количестве установление избирательных участков, оповещение избирателей, инструктирование работников, разработка отчетов, разработка ясных и сжатых наказов и т. д.).

5. Связаться в общественными комсомольскими, профессиональными организациями города и деревни по предмет максимального участия этих организаций в кампании и увязки их планов с планами избирательных комиссий; в частности обратить внимание на участие в кампании в деревне союза работников земли и леса и комитетов крестьянской взаимопомощи;

6. При проведении отчетной кампании необходимо обратить особенное внимание на освещение в отчетах степени выполнения советами наказов избирателей, развернув, наряду с общими отчетами, широкую отчетность отдельных депутатов о своей работе, а также расширить отчетность исполнительных комитетов перед советами и избирателями. В целях обеспечения качества этих отчетов необходимо подобрать и подготовить надлежащий кадр опытных работников.

7. Необходимо обеспечить наиболее полное обслуживание национальных меньшинств и вовлечение их в активное участие в кампании, путем детально разработанных мероприятий.

8. Одной из важнейших задач настоящего момента является также закрепление в наступающую перевыборную кампанию той большой заинтересованности трудящихся женщин советским строительством, проявленной на недавно проведенных местных и Всесоюзном с'ездах. Трудящиеся женщины должны быть максимально вовлечены как в предвыборные мероприятия, так и в избирательную кампанию, а их актив—безусловно в более широкой степени, нежели прежде, должен быть вовлечен в организационную работу по проведению кампании, и в выборный руководящий состав советов и исполкомов.

9. Насущнейшей задачею в перевыборной кампании этого года является также наиболее полное вовлечение батрачества и бедноты, все еще недостаточно участвовавших в прошлогодних перевыборах. Необходимо разработать и провести ряд конкретных мероприятий, которые обеспечивали бы максимальный подъём активности батрачества и бедноты в перевыборной кампании этого года, а также дальнейшее увеличение их удельного веса в выборном составе советов и исполкомов.

10. Необходимо широко использовать на протяжении предвыборной кампании крестьянский бедняцкий актив, вовлекшы его как в подготовительную работу, так и в проведение самой отчетной кампании и перевыборов.

11. Затем во время предвыборной кампании необходимо обратить особенное внимание на тщательную подготовку и подбор кандидатур в советы, поставив их на всестороннее обсуждение предвыборных собраний батрачества, бедноты, женщин, профсоюзов, беспартийного рабочего и крестьянского актива и т. д.

12. Полное осуществление этих мероприятий даст возможность проведение на выборах широкой пролетарской демократии, каковая ни в каком случае не должна подмениваться методами механического воздействия на избирателей.

Отмечая эти задачи очередных перевыборов, Президиум Центрального Исполнительного Комитета обращает ваше внимание на важность полного количественного и качественного учета кампании и проводимых в связи с нею мероприятий и их результатов.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.
Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.
1 декабря 1927 г.
г. Минск.

Постановление

Президиума Центрального Исполнительного Комитета БССР

об организации окружных и утверждении председателей окружных избирательных комиссий.

Президиум Центрального Исполнительного Комитета постановляет:

1. Предложить окружным исполнительным комитетам немедленно приступить к организации окружных, районных, городских, местечковых и сельских избирательных комиссий, руководствуясь при их создании инструкцией о выборах в советы БССР, утвержденной Президиумом Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР 26 ноября 1927 г.

2. Председателями окружных избирательных комиссий утвердить:

а) по Бобруйскому окр.—тов. Рачицкого,
б) по Витебскому окр.—т. Павлюкевича,
в) по Гомельскому окр.—т. Молоковича,
г) по Минск